Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навынарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародзяе	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок пашпарэлі наперад тэксту 1 р. — к.
За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. дарожэй.
Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцам за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 168 (2356) Нядзеля, 22-га ліпеня 1928 г.

ТЫДЗЕНЬ АБАРОНЫ У БССР.

У ПРОЦІВАГУ ФАШЫСЦКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ БУРЖУАЗЕІ МЫ ПАВІННЫ СТВАРЫЦЬ МІЛІЁННЫЯ КАЛЁНЫ ВАЕНІЗАВАНЫХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН.

ШЛЯХІ ВАЕНІЗАЦЫІ.

(Артыкул Начальніка Галоўнага Кіраўніцтва РСЧА т. Левічэва).

„Тыдзень Абароны" прыцягнуў увагу насяленьня да пытаньняў ваенізацыі.

Неабходнасьць шырокага ваеннага навучаньня насяленьня тлумачыцца ўзрастаючай складанасьцю вайсковай справы наогул і кожнага байца ў асобку. Гэта робіцца ў залежнасьці ад колькаснага і якаснага росту тэхнічных сродкаў барацьбы, якія дастаўляюцца сучаснай арміі.

Адгэтуль канкрэтныя задачы грамадзкасьці накіроўваюцца па дзьвюх лініях: грамадзкая дапамога дзяржаве сродкамі для ўзмацненьня тэхнічнай магутнасьці ўзброеных сіл, збор сродкаў на эскадрыльі паветранага флёту, танкі і г. д. і другая— вайскова-тэхнічнае навучаньне членаў ТДА-Авіяхімаўскай арганізацыі. Першыя крокі грамады па прыцягненьні грамадзкіх сродкаў для будаўніцтва чырвонага паветранага флёту і хэмічнай прамысловасьці далі вялікія вынікі.

У менш спрыяючых умовах праходзіць вайскова-тэхнічная падрыхтоўка членаў ТДА-Авіяхіму. Многія разважаюць наступным чынам: „Якое можа быць вайсковае навучаньне без стральніны, без практычных заняткаў пры кулямёце, гармаце, танку, самалёце, калі ў прапагандзе асабліва яскрава падкрэсьліваецца характар будучай вайны, як вайны з шырокім ужываньнем тэхнічных сродкаў". Разважаючыя такім чынам забываюць, што вайсковае навучаньне нават з перавагаю «літаратуры»—справа вельмі карысная, а пры ўменьні ўнесьці творчасьць праца вайсковых гурткоў будзе самай сапраўднай вайскова-выхаваўчай працай па падрыхтоўцы байцоў арміі ваеннага часу.

Вайсковую падрыхтоўку насяленьня па-за армейскім шляхам на мы надумалі. Буржуазея, вярбуючы сотні тысяч у дабраахвотныя арганізацыі з людзей, у першую чаргу, сваёй клясы і з пластоў, блізка стаячых да пануючай клясы, глядзіць на іх, як на рэзэрвы людзкіх сіл для вайны. Іх вайскова-тэхнічная падрыхтоўка, зразумела, далёка недасканалая, аднак росту і згрупаваньню фашысцкіх ваенных арганізацый буржуазея аддае шмат увагі і адпускае вялікія субсыдыі. Справа тут крыецца ў тым, што ў гэтых арганізацыях буржуазея апрацоўвае палітычна і маральна шырокія колы ў духу мілітарызму, у духу клясавай барацьбы супроць нарастаючай сацыялістычнай грамады.

Новая вайна, якая падрыхтоўваецца імпэрыялістымі, будзе характарызавацца ня толькі тым, што на палёх боек будуць прадстаўлены новыя, больш удасканаленыя сродкі зьнішчэньня сучаснай тэхнікі і ў большай колькасьці, чымся ў часе імпэрыялістычнай вайны, і ня тым, што на вайну будуць працаваць вялізарныя прадпрыёмствы і амаль уся гаспадарка краіны ў цэлым, але ня ў меншай меры і тым, што вайну будзе весьці адноўлены салдат, у параўнаньні з імпэрыялістычнай вайной, што вакол вырабу рэчаў узброеньня будуць сьцягнуты міліёны рабочай клясы. Салдату, якога буржуазея пацягне на фронт, і рабочаму, сьцягнутаму ў мілітарызаваныя прадпрыёмствы, памятны дзесяткі міліёнаў магіл, якія запоўнены трупамі працоўных у выніку імпэрыялістычнай вайны.

А што атрымала рабочая кляса, працоўныя масы і ў краінах пераможных і ў краінах пераможаных? Нічога, апроч няволі, апроч павялічанай эксплёатацыі для новых прыбыткаў капіталістаў, для адбудовы дзяржаў, зруйнаваных вайной. Рабочая кляса ў пасьляваенныя гады атрымала лютыя вурокі клясавай барацьбы, яна пашырыла кадры рэвалюцыйных барацьбітоў—яна бачыць узор новай дзяржавы на прыкладзе Савецкага Саюзу і ўжо далёка ня так лёгка буржуазеі прымусіць яе несьці ахвяры ў імя яе інтарэсаў.

Насустрач надыходзячай ваеннай небясьпецы мы павінны рыхтаваць новага рэвалюцыйнага салдата ў арміі і па-за ёю. Пры гэтым асноўным лёзунгам вайсковай падрыхтоўкі павінна быць тое, што рашаючым у будучай вайне будзе чалавек: устойлівасьць арміі будзе залежаць ад палітычнай і маральнай устойлівасьці яе байцоў.

Уласна гэты пачатак і асновы вайсковай справы загартоўваюцца ў ваенізуемым насяленьні. Тое, што ў вайсковай падрыхтоўцы слаба ўдасканальваюцца чыста ваенна-тэхнічныя навыкі—не бяда. Яны дапоўняцца і хутка прыўюцца на кароткатэрміновых зборах, якія праводзіць ужо вайсковая арганізацыя. На падставе папярэдняй ваеннай падрыхтоўкі ў арганізацыях ТДА-Авіяхіму ня цяжка будзе прывіць байцу навыкі ўладаньня найбольш складанымі ваеннымі мэханізмамі.

У процівагу дабраахвотным фашысцкім арганізацыям буржуазеі мы павінны стварыць міліённыя калёны ваенізаваных рабочых і сялян.

Больш увагі ваенізацыі сяброў прафсаюзаў.

(*Гутарка з адказным сэкратаром ЦСПСБ т. Ісаевым*).

У пляне работы ЦСПСБ у шэрагу з іншымі практычнымі задачамі пізавых саюзных ячэек было пастаўлена пытаньне і аб працы Цэнтральнага Савету ТДА-Авіяхіму.

Прэзыдыум ЦСПСБ напярэдадні «Тыдню Абароны» меў на ўвазе заслухаць даклад ЦСТДА-Авіяхіму, але за адсутнасьцю дакладчыка гэтага зрабіць не ўдалося, і гэты даклад быў абгаворан толькі некалькі дзён таму назад. На пасяджэньні прэзыдыуму высьветлілася, што нашы прафэсыйныя арганізацыі да „Тыдню Абароны" аднесьліся з належнай увагай і правялі намечаную падрыхтоўчую працу па ўсёй пэрыферыі саюзных арганізацый.

Але побач з гэтым высьветлілася, што праца па ваенізацыі членаў саюзаў ня зусім добра ўвязана з Ц. Сав. ТДА-Авіяхіму,—аб гэтым сьведчыў і даклад апошняга, бо дакладчык рабіў фактычна не даклад аб працы ТДА-Авіяхіму, а аб тых разгалосьсях, якія маюцца ў працы па ваенізацыі паміж прафарганізацыямі і ТДА-Авіяхімам.

Мы лічым, што асноўнай ячэйкай па практычнаму правядзеньню працы па ваенізацыі павінен быць ТДА-Авіяхім, але разам з тым прафсаюзы павінны аказваць дапамогу, шляхам вярбоўкі сяброў у ячэйкі ТДА-Авіяхіму, у абсталяваньні вайсковых куткоў, цірэў для стральбы, у набыцьці вайсковай літаратуры і г. д.; так, у масавай культураай працы прафсаюзаў павінны знайсьці больш адбітак элемэнты ваенізацыі. Асабліва гэта важна для прафсаюзаў Беларусі, якая знаходзіцца на мяжы з буржуазнай краінай.

Сярод членаў саюзаў назіраецца надзвычайнае імкненьне навучыцца ўладаць стрэльбай, але гэта ў большасьці немагчыма выканаць, бо незаўсёды можна дастаць стрэльбы, а таксама і іншыя вайсковыя прылады. Цэнтральнаму Савету ТДА-Авіяхіму, а таксама і ЦСПСБ неабходна паставіць пытаньне перад адпаведнымі органамі аб павялічэньні колькасьці вайсковых прыладаў, а асабліва стрэльбаў для вайсковых гурткоў.

Апрача таго, на працы вайсковых гурткоў адбіваецца і недахват кіраўнікоў апошнімі. ЦСПСБ трэба падумаць аб арганізацыі спэцыяльных курсаў па падрыхтоўцы інструктароў для вайсковых гурткоў на прадпрыёмствах.

У далейшым неабходна зьвярнуць увагу на ўзмацненьне вайсковай працы наогул сярод прафсаюзаў; асабліва-ж увага павінна быць зьвернута на ўвязку працы па ваенізацыі працоўных паміж прафсаюзамі, ТДА-Авіяхімам, камсамолам, Чырвоным Крыжам і іншымі арганізацыямі, бо адсутнасьць увязкі адбіваецца на плянавай працы прафсаюзаў у галіне ваенізацыі, а таксама і на якасьці апошняй.

З такой працай далёка не заедзеш.

(Ячэйка ТДА-Авіяхіму віцебскіх пажарнікаў).

Яшчэ 8 чэрвеня бюро ячэйкі ТДА-Авіяхіму віцебскай пажарнай каманды пры зацьверджаньні пляну правядзеньня „Тыдню Абароны" пастанавіла 14 ліпеня наладзіць у садзе павільён пажарнага таварыства спэктакль-канцэрт, але дагэтуль яшчэ нічога ня зроблена.

Падпісных лістоў і па сёнешні дзень у ячэйцы ніхто ня бачыў, ня прыступлена таксама да працы па ліквідацыі запазычанасьці па сяброўскіх узносах.

Пастанавілі таксама правесьці трэніроўку з супрацьгазамі, але аб гэтым, відаць, запамятавалі.

На апошнім пасяджэньні бюро ячэйкі накінуліся ўсе члены апошняга на тэхнічнага сэкратара, што ён не вядзе ніякай працы, а самі недалёка адышлі ад яго. У першы дзень скарбоначнага збору 7 чалавек нашых актывістаў-партыйцаў не захацелі пайсьці з скарбонкамі.

З такой працай далёка не заедзеш.

Сялянства і абарона краіны.

Савецкі Саюз знаходзіцца ў капіталістычным абкружэньні; яго з усіх бакоў абкружаюць ворагі ў асобе сусьветнага блёку фабрыкантаў і капіталістаў. А таму кожны грамадзянін Савецкага Саюзу павінен быць заўсёды гатоў на выпадак ваеннай завірухі, быць гатовым бараніць сваю краіну ад нападу ворагаў, бараніць савецкую ўладу і дыктатуру пралетарыяту.

Савецкі Саюз — краіна пераважна сялянская, у карыстаньне якога перайшла значная колькасьць зямель былых абшарнікаў. Але, каб трымаць у сваіх руках гэту зямлю, асабліва ў умовах Савецкай Беларусі, як краіны прымежнай, сялянства павінна памятаць, што ворагі саветаў ня сьпяць, і яно павінна прымаць актыўны ўдзел у абароне краіны.

Сялянства Савецкай Беларусі павінна ўступаць у ячэйкі ТДА-Авіяхіму і навучыцца практычнай абароне краіны. У БССР бяднейшае сялянства арганізавана ў моцныя аб'яднаньні—у камітэты сялянскай узаемадапамогі. Такіх камітэтаў зараз налічваецца 1496, якія яднаюць 1487942 сяброў. Гэта ўжо ёсьць магутная арганізаваная армія, аб'яднаная паміж сабою супольнасьцю інтарэсаў. Перад камітэтамі ўзаемадапамогі зараз стаіць баявая і неадкладная задача—ўцягнуць усю гэту армію сялянства ў ячэйкі ТДА-Авіяхіму.

На нашу думку, гэтым толькі не павінна абмежавацца дзейнасьць камітэтаў узаемадапамогі. Яны павінны сваім прыкладам уплываць і на несяброў т-ваў; яны павінны праводзіць актыўную працу па ваенізацыі сярод шырокіх мас вёскі, уцягваючы ў ячэйкі дарослых сялян, жанчын і моладзь. На таварыствах сялянскай узаемадапамогі ляжыць гэты маральны абавязак яшчэ і таму, што ўсе яны зьяўляюцца юрыдычнымі членамі ТДА-Авіяхіму.

«Тыдзень Абароны» павінен прайсьці ў вёсцы ня толькі пад знакам абароны краіны, пад знакам згрупаваньня вакол ячэек ТДА-Авіяхіму усіх жывых сіл вёскі, але і пад знакам павялічэньня ўраджаю.

Апрача ваенізацыі насельніцтва, перад ТДА-Авіяхіму ў вёсцы стаіць задача весьці барацьбу з рознімі шкодлівікамі, якія зараз нішчаць нашы палявыя і гародныя культуры, ячэйкі ТДА-Авіяхіму павінны папулярызаваць у вёсцы мінэральнае ўгнаеньне, хэмізацыю сельскай гаспадаркі, што падвоіць, а то і патроіць нашы нэндзныя ўраджаі. Кожны селянін павінен памятаць, што ячэйкі ТДА-Авіяхіму ў вёсцы будуць зьяўляцца ня толькі школамі падрыхтоўкі па абароне краіны ад нападу ворагаў, але і школаю культурнага вядзеньня сельскай гаспадаркі і ўцягненьня ў сельска-гаспадарчае карыстаньне новых абшараў пустапарожніх зямель.

Мінулая кампанія «Тыдню Абароны» на вёсцы паказала, што сялянства чула адносіцца да справы абароны краіны. Ніводзін гаспадар не адмаўляўся даць ахвяраваньне на карысьць ТДА-Авіяхіму. Мы спадзяёмся, што і сёлета беларускі селянін з гонарам выканае свой грамадзкі абавязак перад сваёй сацыялістычнай бацькаўшчынай.

Усё сялянства, як адзін, у шэрагі ТДА-Авіяхіму!

П. Калінін.

ПРАЦА ВЯДЗЕЦЦА ДОБРА.

(Мазырскі Акрземаддзел).

Сёлета праца значна палепшылася. Сяброў у ячэйцы налічваецца 73 чал. Канцэлярскі склад уцягнут на ўсе 100 проц.

Ужо абсталёван вайсковы куток; маецца бібліятэчка вайсковых ведаў. Узімку гэты куток працаваў вельмі добра: праводзіліся чыткі і г. д. Былі ўцягнуты ў працу ячэйкі і спэцыялісты. Выпісваецца для кутка часопісь «Авіяцыя і хэмія» і 2 газэты—«На стражы» і «Чырвоная Зорка».

У апошні час праведзена індывідуальная падпіска на газэту—падпісаліся 23 супрацоўнікі. Была праведзена кампанія па распаўсюджваньні лётарэйных білетаў. Быў пушчан падпісны ліст на набудову самалёта імя «Сако і Ванцэці». Падпіска дала 25 руб. Распаўсюджана к сьвяту 1-га Мая 20 шт. значкоў Авіяхіму. Сяброўскія ўзносы паступаюць свачасова, і запазычанасьці няма.

Наладжана праца ў гуртку вайсковых ведаў, які праводзіць як тэарэтычныя, так і практычныя заняткі. Гурток вайсковых ведаў прымаў удзел у спаборніцтвах.

Пры аб'езьдзе спэцыялістаў у раёны ім дадзены былі належныя інструкцыі па працы ў вёсцы. **Фруман.**

Ячэйка прачнулася.

(Віцебск, мясцком № 1 пры ст. МББ).

У «Тыдзень Абароны» праводзіцца агляд ячэек ТДА-Авіяхіму і падвядзеньне вынікаў іх працы за апошні год у галіне падняцьця абароназдольнасьці краіны Саветаў.

Што-ж зроблена ў гэтай галіне ячэйкай мясцкому № 1 чыгуначнай станцыі МББ?

Ячэйка зараз налічвае каля 480 сяброў. Пры ячэйцы маецца вайсковы гурток, а таксама ёсьць і стралковы. Апрача таго, шмат таварышоў наведвалі існуючыя пры вузьле гурткі—гурток вайсковых ведаў і хэмічнай каманды.

Ячэйка зрабіла 2 выхады ў поле разам з ячэйкай вузла, дзе праводзіліся практычныя заняткі гурткоў. Апрача таго, зроблена адно хэмічнае абкурваньне гуртка.

Разам з тым трэба адзначыць, што большасьць сяброў ячэйкі, відаць, мала зацікаўлены працай ячэйкі і значная частка іх мае заназычанасьць па сяброўскіх узносах за 4-5 месяцаў. Рэвізійная камісія не зьявілася. Урэшце, прышлося даклад зьняць з парадку дню.

Абураныя гэтым, члены саюзу на другі дзень ня прышлі па дэманстрацыю.

Вы думаеце, што такі выпадак быў толькі ў клюбе мэталістаў?

Мыляецеся,—суботнія гутаркі на заводзе аб значэньні „Тыдню Абароны" былі таксама сарваны, бо дакладчык ТДА-Авіяхіму ня прышоў.

Посьпехі і недахопы „Тыдню".

(Гомель).

19 ліпеня адбыліся стралковыя спаборніцтвы жаночых стралковых гурткоў, а 20—паміж мужчынскімі гурткамі. Вынікі спаборніцтваў сьведчаць аб тым, што справа ваенізацыі працоўных Гомелю насоўваецца наперад.

22 ліпеня ТДА-Авіяхіму наладжвае масавае гуляньне ў парку імя Луначарскага. На левым беразе р. Сожу будзе праведзена інсэнэіроўка бою. У гэты-ж дзень у Доме Чырвонай арміі будуць праведзены прызывныя спаборніцтвы на веданьне вінтоўкі і супрацьгазаў. Пры жактах «Кастрычнік», «Пралетары» і «Чырвоная Зорка» ў гэтыя дні арганізаваны ячэйкі ТДА-Авіяхіму. Арганізавана жаночая ячэйка ТДА-Авіяхіму і пры Доме Чырвонай арміі.

Райсаветы ТДА-Авіяхіму Церахоўскага, Буда-Кашалёўскага і Ветрынскага райёнаў яшчэ не разгарнулі працы па правядзеньню «Тыдню Абароны». Прэзыдыум акрсавету ТДА-Авіяхіму запрапанаваў гэтым райсаветам прыняць меры да пасьпяховага правядзеньня «Тыдню».

90 проц. членаў саюзу друкароў у шэрагах ТДА-Авіяхіму.

(*Магілеў*).

З пачатку існаваньня ячэйкі ТДА-Авіяхіму пры саюзе друкароў уся праца яе складалася толькі са збору сяброўскіх узносаў. Пасьля перавыбару бюро ячэйкі праца пакрыху пачала ажывацьца.

У канцы сакавіка пры друкарні адчыніўся цір, які вельмі зацікавіў сяброў ячэйкі. Праз некаторы час быў арганізаваны і вайсковы гурток, у якім займалася рэгулярна 20 чалавек.

Бюро выпісала 2 часопісі—«Красноармеец» і «Авиация і Химия». З посьпехам прайшоў праведзены ячэйкай вясной конкурс на лепшага стралка.

16 ліпеня ячэйка правяла агульны сход сяброў, на якім стаяў даклад аб значэньні і задачах таварыства і справаздача бюро. У сучасны момант вядзецца праца па збору сродкаў у фонд абароны па падпісному лісту. Зараз у ТДА-Авіяхіме каля 90 проц. членаў нашага саюзу; вядзецца кампанія за тое, каб уцягнуць у таварыства і астатніх членаў саюзу друкароў Магілева.

Не адстаем у ваенізацыі.

(Віцебск).

Ячэйка ТДА-Авіяхіму прадпрыёмстваў Віцебскага камунальнага трэсту за апошнія месяцы ўцягнула ў сябры таварыства каля 75 проц. усіх рабочых. К «Тыдню Абароны» ячэйка налічвае 219 таварышоў. Існуюць пры ячэйцы розныя практычныя гурткі па ваенізацыі, якімі ахоплена 152 чал. Рэшта-ж сяброў ячэйкі ніякай працы не вядзе і лічыцца толькі на паперы.

У часе «Тыдню Абароны» праводзіцца вучот ячэйкі ТДА-Авіяхіму і працы гурткоў, якіх, да слова сказаць, існуе тры: гурток вайсковых ведаў, хэмічная каманда і гурток першай дапамогі. Праводзіцца таксама вярбоўка новых сяброў і абсталёўваецца цір.

На агульных сходах рабочых ставяцца даклады аб абароназдольнасьці краіны і задачах ТДА-Авіяхіму. Мяркуецца зрабіць адзін выхад у поле, дзе будуць праведзены тактычныя заняткі з гурткамі.

Гомельскі акрсавет ТДА зрывае сходы.

Для выпрацоўкі пляну правядзеньня «Тыдню Абароны» праўленьне пляну было патрэбна некалькі дакладчыкаў, і адказны сэкратар акрсавету ТДА-Авіяхіму абяцаў іх свачасова прысłаць.

Для выпрацоўкі пляну правядзеньня «Тыдню Абароны» праўленьне клюбу мэталістаў рабіла спробу склікаць сход сэкратароў ячэек ТДА-Авіяхіму і старшынь культкамісій, але... сход не адбыўся, бо амаль што ніхто з выкліканых ня прышоў.

Не зважаючы на гэта, праўленьне клюбу ўсё-ж план правядзеньня «Тыдню Абароны» выпрацавала і ён быў зацьверджаны нарадай культпрацаўнікоў пры Акрпрафбюро.

Здавалася-б, што ўсе перашкоды перамаглі.

Так, адны перамаглі, а зьявіліся другія. Для ажыцьцяўленьня пляну было патрэбна некалькі дакладчыкаў, і адказны сэкратар акрсавету ТДА-Авіяхіму абяцаў іх свачасова прысłаць.

І вось 14 ліпеня а 8-ай гадзіне ўвечары заля клюбу была перапоўнена рабочымі. Усё было гатова, але толькі маленькае «але». Чакалі 2 гадзіны, нават члены клюбу ўвесь час бегалі шукалі дакладчыкаў, а апошнія так і не сачылі за працай ячэйкі. У люты, у часе перадачы спраў ячэйкі новаму бюро, аказаўся недахоп грошай у 70 руб., якія растраціў былы сэкратар ячэйкі. Праўда, грошы гэтыя ён папоўніў. Наогул трэба сказаць, што грашовы вучот і вучот сяброў ячэйкі дагэтуль ня вёўся.

У „Тыдзень Абароны" ячэйка прачнулася і ўзялася за аздараўленьне працы. Ч—ы.

Парад францускага імпэрыялізму ў Гаўры.

(Артыкул члена ЦК францускай кампартыі тав. А. Марці).

Францускі імпэрыялізм толькі што прадэманстраваў у Гаўры свае найбольш удасканаленыя сродкі вайны. Усе буржуазныя газэты з гордасьцю падкрэсьлівалі, што агляд ваенна-марскіх сіл Францыі, які адбыўся 3-га ліпеня, зьявіўся самай буйнай канцэнтрацыяй гэтых сіл, якую можна было бачыць у Францыі з 1914 г. У тры рады сталі 84 ваенныя судны і расьцягнуліся на 11 кілёмэтраў. На іх мелася каля 300 гармат вялікага і сярэдняга калібру, здольных у любы момант перакінуць дзесяткі тон мэлініту на адлегласьць 20-25 кілём., некалькі апаратаў для кіданьня, якія могуць выкінуць у ваду 600 мін у 500 міліметраў.

Да гэтых страшных марскіх ваенных сіл далучыліся 56 гідраплянаў, у тым ліку тры эскадрыльі, вымешчаныя на спэцыяльных параходах. У маневёўрах прымалі ўдзел 15000 матросаў.

Руйнуючая сіла ўсіх гэтых сродкаў вайны даведзена да максымуму, бо звыш 40 ваенных суднаў было пабудавана пасьля вайны. У працягу апошніх 10 год штогод і рэгулярна выпушчаліся адзін новы крэйсэр, тры контрмінаноскі, чатыры мінаноскі і шэсьць падводных лодак. Такім чынам, за пэрыяд ад 1920-28 г. пабудавана было каля 120 суднаў. У той-жа самы час, калі ўрад і парлямант вядуць з рабочымі самую лютую барацьбу па пытаньнях зарплаты, выдаткі на пабудову новых ваенных суднаў складалі ў 1927 годзе 360 млн. франкаў, а ў 1928 г. яны складуць лічбу ў адзін міліярд 341 млн. франкаў.

З вайсковага штогодніка Лігі Нацый мы даведваемся, што ў 1913 г. францускі ваенны флёт ахапляў 9,9 проц. танажу ўсіх флётаў усяго сьвету. У 1926 г. ён складаў ужо 10,5 проц., а ў 1928 г. Францыя мае флёт сярэдняга танажу ў 360000 тон і, апроч таго, вельмі значны паветрана-марскі ваенны флёт.

Усе гэтыя лічбы з поўнай перакананасьцю паказваюць шпаркі рост імпэрыялістычнага ўзбраеньня Францыі ў зьвязку з ростам яе імпэрыялістычных тэндэнцый. Гэта выклікае аналёгічныя патугі і іншых імпэрыялістаў, у прыватнасьці Італіі. Канкурэнцыя ў галіне ўзбраеньня адбываецца такім самым сьпешным тэмпам, як і ў годы перад сусьветнай вайной. Усё гэта нямінуча павінна павесьці да вайны.

Гэтая падрыхтоўка да вайны робіцца яшчэ больш яснай у сувязі з заданьнем манэўраў перад аглядам. Поруч з курсіраваньнем уздоўж узьбярэжжа Алжыру і Марока для застрашваньня калёніяльных нарадаў, першым заданьнем быў напад падводных лодак пад прыкрыцьцем ваенных суднаў сярэдняга танажу і самалётаў.

З другога боку, прэзыдэнт францускай рэспублікі ў сваёй прамове падкрэсьліў «ня менш істотную неабходнасьць заставацца ў непарыўнай сувязі з калёніямі і поўнасьцю забясьпечыць свабоду мораў». Новая арганізацыя сухаземных ваенных сіл пралугледжвае выкарыстаньне Афрыкі ў якасьці дастаўшчыка гарматнага мяса.

Між іншым, францускі ўрад скарыстаў гэта, каб падкрэсьліць таксама ў друку, што францускія паветраныя ваенныя сілы яшчэ ня могуць параўнацца з паветрана-марскім флётам Італіі. Іншымі словамі, францускі ўрад мяркуе таксама ўзмацніць і свой ваенны паветрана-марскі флёт.

Арганізацыя вялікіх сухаземных манэўраў, урачыстыя «дні авіяцыі», флёцкія манэўры і парад у Гаўры,—усё гэта зьяўляецца бясспрэчным доказам агрэсыўных тэндэнцый францускае буржуазеі.

Буржуазея дасканала ведае, што для таго, каб яна мела магчымасьць весьці вайну, неабходна, каб большасьць рабочых і сялян засталася зусім пасыўнай. Вось чаму яна прыцягнула да ўдзелу ў гаўрокім аглядзе сацыяліста Буісона. Аднак, бачачы сацыялістычнага правадыра ў такой ролі, рабочыя дасканала разумеюць, як нізка ўпалі ўсе гэтыя сацыялістычныя правадыры, тыя самыя, якія накіравалі рабочых на бойню ў часе імпэрыялістычнае вайны. Рабочыя з агідаю адвернуцца ад гэтага «сацыяліста», паціскаючага руку адміралу Дэгэру, кату пралетарскае моладзі ў Кальвіі. Яны лепш, чымся калі-небудзь, пазнаюць гэтага «сацыяліста», бачачы, як апякуецца над ім той самы начальнік аховы Рэнар, які праславіўся сваімі прасьледваньнямі і арыштамі камуністаў.

У той час, як дэпутат Буісон балюе з самымі рэакцыйнымі правадырамі мілітарызму, тры з яго калегаў—камуністычныя дэпутаты—загнаны ў падполье і сядзяць у турме з сотнямі іншых рэвалюцыйных барацьбітоў за тое, што яны словам і справаю змагаліся супроць мілітарызму.

Гаўрскі агляд павінен напомніць усе перажытыя кашмарныя годы вайны. Усе рабочыя павінны зразумець, што гэты агляд зьяўляецца вышчуном новых катастрофаў і новых кашмароў. У адказ на ўсе гэтыя дэманстрацыі мілітарызму пралетарыят арганізуе магутныя антымінэрыялістычныя дэманстрацыі. Толькі шляхам такое незаміручае барацьбы ён здолее перашкодзіць новай сусьветнай бойцы.

Парыж, турма Сантэ.

Вакол кітайскіх падзей.

МАНЧЖУРЫЯ І КІТАЙ.

ШАНХАЙ, 20-VII. Японскае агенцтва Тохо паведамляе, з слоў асабістага сэкратара Чжан-Сюэ-Ляна, што мукдэнскія колы лічаць далучэньне Манчжурыі да Кітаю зьдзейсьненым фактам. Чакаюць, што дэлегаты мукдэнскай групоўкі прымуць удзел на будучым пленарным пасяджэньні Гаміндану ў Нанкіне.

* * *

ТОКІЁ, 20-7. Агенцтва Сымбун Рэнго паведамляе: «прэм'ер Танака паведаміў габінэту, што японскі ўрад неафіцыяльна прапанаваў Чжан-Сюэ-Ляну недапушчаць ваенных дзеньняў і няладу за тэрыторыяй Манчжурыі, у асабліваецці бальшавізацыі 3-х усходніх правінцый. Апрача таго, Чжан-Сюэ-Ляна паведамілі, што Японія не жадае кампраміса між Мукдэнам і Поўднем. Калі Чжан-Сюэ-Лян зробіць спробу схіснуць пазіцыю Японіі ў Манчжурыі, Японія зробіць рашучыя захады».

Перагляд дацка-кітайскага дагавору.

ШАНХАЙ, 20-VII. Па паведамленьню газэт дацкі пасол у Кітаі перадаў нанкінскаму ўраду, што яго ўрад згодзен вылучыць дэлегацыю для перагляду кітайска-дацкага дагавору.

Франка-кітайскія адносіны.

ШАНХАЙ, 20-VII. Па паведамленьню газэт, францускі консул у Шанхаі думае ўступіць у перамовы з міністрам замежных спраў нанкінскага ўраду Ван-Чжэн-Цінам, па прычыне франка-кітайскіх адносін. Ван-Чжэн-Цін запрасіў францускага консула ў Нанкін.

АБ ПАДВЫШЭНЬНІ ХЛЕБНЫХ ЦЭН.

(*З перадавіцы «Правды»*).

«Задача гаспадарчага кіраўніцтва ў сувязі з падвышэньнем хлебных цэн». Згодна пастаноў ліпэвага пленуму ЦК аб загатоўцы хлеба новага ўраджаю, і ў прыватнасьці аб падвышэньні хлебных цэн, неабходныя ўрадавыя пастановы ўжо прыняты і апублікаваны. Яны павінны ў найкарацейшы тэрмін быць даведзены да ведама самых шырокіх гушчаў сялянства. У сучасны момант трэба арыентаваць пяасельную працу на максымальнае пашырэньне азімага кліну ў будучую пасяўную кампанію.

Трэба памятаць, што да сяўбы засталося ўсяго 3 тыдні. Кожны дзень павінен быць падлічан. Разам з тым, нам трэба прадумаць пытаньні бягучага кіраўніцтва народнай гаспадаркай нашай краіны з пункту гледжаньня ўплыву павышэньня хлебных цэн.

Трэба аддаць сабе справаздачу ў тым, што будзе адзначаць павышэньне хлебных цэн хлебароднай гаспадарцы ў цэлым. Зараз на першым месцы—складаньне гадавых плянаў, разгортваньня гаспадаркі. Хутка на аснове кантрольных цыфраў прыдзецца даваць ужо апэратыўныя паказаньні па розных галінах нашага гаспадарчага жыцьця. Задача заключаецца ў тым, каб ва ўсіх гэтых плянах і паказаньнях наперад быў улічаны ўплыў павышаных хлебных цэн. Уплыў павышаных хлебных цэн на напружанасьць бюджэту, крэдыту прамысловай гаспадаркі і г. д. павінен, шляхам рашучай эканоміі, паралізаваць выдаткі загатоўчых органаў. Павышэньне хлебных цэн, што азначае перадачу больш 100 міліёнаў руб. сялянству на цане хлеба, вымагае ад нашай прамысловасьці вялікага напружаньня сіл, сродкаў і энэргіі. Павышэньне хлебных цэн можа быць дыскрэдытавана ў вачох сялянскіх гушчаў і пазбаўлена імпануючай сілы, калі ўзвышаным прыбытковым паступленьням сялянства ня будзе процістаяць узвышаная таварная дастаўка. Ня гледзячы на ўсю напружанасьць у сродках, партыя ні ў якім выпадку ня можа ісьці на скарачэньне капітальных работ. Ня згортваць індустрыялізацыю, а разгортваць яе—гэткая лінія партыі, гэткая задача. Не скарачэньне капітальнага будаўніцтва і нават не стабілізацыя яго, а расшырэньне ў першую чаргу цяжкай індустрыі—гэткі шлях. Максімум рацыяналізацыі, максімум павышэньня вытворчасьці працы.

Сутычка французаў з арабамі.

Парыж, 20-7. *Па афіцыяльных паведамленьнях, у Паўднёвым Мароко адбылася сутычка між францускім войскам і арабскімі плямёнамі. З абодвых бакоў ёсьць забітыя і параненыя. Сацыялістычная «Папюлер» піша: «Таму што маем справу з афіцыяльным паведамленьнем, напрашываецца пытаньне, ці не хаваюць ад нас сур'ёзных ваенных падзей».*

97 з паловай міліёнаў дэфіцыту.

Гандлёвы балянс Польшчы за чэрвень г. г. прадстаўляецца ў наступным відзе: вываз—1.010.886 тонаў, вартасьць—191.961.000 зл., прывоз—1.475.713 тонаў, вартасьць—289.510.000 зл. Дэфіцыт раўняецца 97.549.000 зл. У бягучым годзе гэта ўжо шосты месяц, як польскі гандаль дае дэфіцыт.

Добрае і кепснае ў працы ячэек.

(Гомельскі райён).

Гомельскі райсавет ТДА-Авіяхіму абсьледаваў працу ячэек у райёне. З абсьледваньня відаць, што ёсьць ячэйкі, дзе праца паўстаўлена нікепска. К прыкладу, ячэйка ТДА-Авіяхіму на конскім заводзе ў Прудку арганізавана ня так даўно, а ўжо праводзіць досыць значную працу. Гэта ячэйка налічвае 106 сяброў, сярод якіх 20 пр. складаюць мясцовыя сяляне. Ячэйка мае досыць добра абсталяваны вайсковы куток, забясьпечаны адпаведнай літаратурай. Арганізавала ячэйка два гурткі—авіяцыйна-хэмічны і стралковы. Гэтыя гурткі працуюць рэгулярна. Цяпер ячэйка прыступіла да арганізацыі гуртка першай дапамогі.

Некалькі горш, але ўсё-ж ня кепска працуе ячэйка ТДА-Авіяхіму на Брылеўскіх цагельных заводах. Тут працуе адзін стралковы гурток; кепска, што няма вайсковага кутка.

Прыкладам кепскай працы могуць служыць ячэйкі клінкернага заводу і Улукоўскага дзіцячага гарадка, дзе ячэйкі існуюць толькі на паперы і ніякай працы не вядуць.

Хроніка „Тыдню Абароны".

У Віцебшчыне.

Акруговы савет ТДА-Авіяхіму атрымаў 20 дробнакалібэрных вінтовак, якія разьмяркоўваюцца па вайскова-стралковых гурткох.

У нядзелю 22 ліпеня пасьля агульна-гарадзкой дэманстрацыі вайсковыя часьці пакажуць шэраг эфэктных карцін: наводка пантоннага мосту, пераправа на паплаўкох, інсэнэіроўка бою і інш.

15 ліпеня ў вайсковым паходзе прыняло ўдзел звыш 400 чалав

Ушанаваньне Макса Гельца.

Нябывалая маніфэстацыя з прычыны вызваленьня Макса Гельца.

БЭРЛІН. Маніфэстацыя сотняў тысяч рабочых, якія віталі Гельца па колькасьці і запалу перавялічылі ўсе пралетарскія дэманстрацыі апошніх год. Масы з нячуваным захапленьнем спаткалі дэкававаны чырвонымі сьцягамі грузавік з Максам Гельцам і іншымі вызваленымі пралетарскімі зьняволенымі, а таксама прадстаўнікамі кампартыі. Чуліся бадзёрыя прывітаньні чырвонага саюзу франтавікоў. Пасьля прамоў прадстаўнікоў ЦК КПН Галейна, Гешке, а таксама прадстаўніка вэнгерскіх рабочых пачалася працэсія праз упрыгожаныя чырвонымі сьцягамі пралетарскія райёны, якая цягнулася некалькі гадзін.

* * *

БЭРЛІН, 20-VII. Гельц прыняў сёньня ўдзел у пасяджэньні сэкратарыяту ЦК кампартыі. Пасьля пасяджэньня адбылося ўшанаваньне Гельца. Эбэрдэйн у сваім прывітаньні абмаляваў бягучыя задачы кампартыі і выказаў упэўненасьць, што Гельц і іншыя амніставаныя вызваленыя палітычныя будуць весьці і далей рэвалюцыйную барацьбу ў шэрагах кампартыі. У адказнай прамове Гельц падкрэсьліў, што ён і іншыя палітычныя абавязаны сваім вызваленьнем націску нямецкага пралетарыяту на чале з кампартыяй і заявіў аб сваёй цьвёрдай рашучасьці працаваць у шэрагах кампартыі і на вызначанай ЦК пасадзе. Ушанаваньне скончылася сьпевамі Інтэрнацыяналу.

Гэройства „Красіна" зьдзіўляе ўвесь сьвет.

Характарыстыка дзейнасьці нашай экспэдыцыі дацкай прэсай

СТАКГОЛЬМ, 19-7. Апошнія нумары шырока распаўсюджанай ў Даніі буржуазна-радыкальнай газэты «Палітыкен» адпушчаюць шмат месца гэройствам экспэдыцыі лёдаколу „Красін" і савецкіх лятуноў. Газэта між іншым піша: «якая дзіўная гульня долі, якая паставіла непрымірымых ідэалёгічных ворагаў—фашыстаў і бальшавікоў—у цэнтры драмы. З аднаго боку—Італія і Нобіле. За імі фашызм. З другога боку «Красін» і Самойловіч. За імі стаіць усімі пагарджаны бальшавізм. Савецкая Расея, якая і сёньня шальмуецца, як краіна барбараў, безчалавечая краіна. Але вось менавіта гэтыя «варвары», гэтыя «ворагі цывілізацыі і культуры» пры першым поклічы аб помачы рынуліся выконваць яе і выканалі яе бяз шуму, бяз рэклямы, без сэнтымэнталізму. Гэройствы „Красіна» азначаюць, што Савецкая Расея ў разуменьні чалавецтва ўвайшла зараз, як роўнасільная і роўнапраўная краіна ў сям'ю культурных эўрапейскіх краін.

Няўжо гэтыя гэройскія ўчынкі астануцца бяз вынікаў у палітычных адносінах Эўропы да савецкага ўраду?»

Хваля захапленьня нашай экспэдыцыяй.

СТАКГОЛЬМ, 19-7. Пасьля захапляючых водзываў усёй швэдзкай сталічнай прэсы хваля захапленьня савецкай выратаваўчай экспэдыцыяй перакінулася ў правінцыю. «Эрэсудэнс Постэн» між іншым піша: «расейскі лётнік, пацярпеўшы аварыю, раней усяго заклікае ратаваць іншых больш патрабуючых дапамогі. Гэта наводзе нас на вельмі прыемныя параўнаньні. Расейская экспэдыцыя робіць гэраічныя ўчынкі без пазалоткі, спакойна і бяз жэстаў. І гэта робіць прадстаўнікі народу, як іх лічаць барбарамі, ворагамі цывілізацыі. «Красін» даў лекцыю Эўропе. Зараз ня так лёгка будзе лаіць расейцаў, што ўсякі крыху ўзгадаваны чалавек да сёньня лічыў сваім неад'емным правам гэта рабіць.»

Супрацоўніцтва „Красіна" з швэдамі.

СТАКГОЛЬМ, 20-VII. Швэдзкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „Начальнік швэдзкай ратунковай экспэдыцыі на Шпіцбергэне, як відаць, яшчэ да атрыманьня загаду аб павароце назад экспэдыцыі, тэлеграфна паведаміў аб вынніках сваіх нарад з камандаваньнем савецкай экспэдыцыі на лёдаколе „Красін". Савецкая экспэдыцыя адносіцца прыхільна да супрацоўніцтва з швэдамі ў пошуках групы Александэра і Амундсэна, якія распачнуцца праз 10 дзён, пасьля скончэньня рамонту лёдакола. «Красін» можа служыць базай для двух гідрасамалётаў і адной авіяткі. Швэдзкі карабель «Кэст» будзе яму спадарожнічаць у якасьці плавучай казармы.

Падзяка Самойловічу і „Красіну".

ПРАГА, 20-VII. Па прапанове камфракцыі, муніцыпальны савет Прагі аднагалосна пастанавіў выказаць падзяку прафэсару Самойловічу і экіпажу „Красіна" за выратаваньне часкага фізыка прафэсара Бэгоўніка, які знаходзіўся з групай Вільеры.

Дзе Амундсэн?

БЭРЛІН, 20-VII. Па паведамленьню стакгольмскага карэспандэнта «Берлінэр Тагеблят», у аўтарытэтных колах Швэцыі прыпушчаюць, што Амундсэн, Дытрыксэн і Гільбо знаходзяцца разам з тэй часткай экіпажу „Італіі", яная была аднесена з абалонкай дырыжыбля. У Швэцыі прыпушчаюць, што абедзьве групы яшчэ жывыя, хоць ужо 55 дзён нічога невядома аб групе Александэра.

Распад льдзістых палёў у зоне, дзе прыпушчаліся месцазнаходжаньне групы Александэра, працягваецца. У Швэцыі дзеля гэтага разьлічваюць, што „Красіну" пры паўторным рэйсе пашчасьціць прабіцца значна далей на Поўнач.

ХАЦЕЛІ СХАВАЦЬ, АЛЕ НЕ ЎДАЛОСЯ.

ЛЁНДАН, 20-VII Штотыдзёвік незалежнай рабочай партыі „Нью-Лідэр" камэнтуе ратунковыя работы экспэдыцыі «Красіна», піша: «ангельская прэса доўгі час хавала імёны і нацыянальнасьць збаўцаў, якія дасягнулі поспехаў там, дзе іншыя нацыі пацярпелі няўдачу і дзе Англія неадважылася ўзяцца за справу.

Усё-ж-такі «Красіну" ўдалося шмат разьбіць лёду варожасьці між Англіяй і СССР».

НОБІЛЕ І ФАШЫЗМ.

Нью-ЁРК, 20-VII. Газэта «Нью Ёрк Ўэйнг-Пост» заяўляе, што захаваньне Нобіле характэрна для фашызму. Газэта піша: захаваньне Нобіле служыць трагічным камэнтарыем да канцэсіі Мусаліні аб правадырох. Нобіле кінуў сваіх людзей. Ён зрабіў адно тое, што мог-бы зрабіць які хочаш правадыр фашызму пры падобных умовах. Трагедыя з Нобіле, бязсумніву, будзе мець вялікае палітычнае значэньне. Яна хала ўжо пэўныя выгады СССР і, бязумоўна, пашкодзіць фашызму і Італіі".

VI кангрэс Камуністычнага Інтэрнацыяналу

МАСКВА, 19-7. Ранішняе пасяджэньне кангрэсу Камінтэрну 19-га ліпеня адчыняецца канцом дакладу Бухарына. Пасьля прамовы Бухарына з дакладам аб працы КІМ'у выступае т. Шыльлер.

Прамова т. Шыльлера.

Ён асьвятляе свой даклад дзьвюма тэмамі, як адбілася зьмена міжнароднага становішча на задачах моладзі і якая была праца КІМ'у за справаздачны пэрыяд. У сваім дакладзе,—гаворыць т. Шыльлер,—таварыш Бухарын зазначыў, што на палітычнай аране зараз паявілася новае пакаленьне моладзі, якая нарадзілася непасрэдна перад вайною і ў часе яе. Новыя кадры ўступілі ў сьвядомае палітычнае жыцьцё ў пэрыяд стабілізацыі. Таму да іх патрэбны з боку КІМ асабліва падыход. Стабілізацыя і зьвязаная з ёю рацыяналізацыя прывялі да шырокага ўжываньня некваліфікаванае працы. Гэта зьменшыла ролю вучнёўства ў прамысловасьці і выклікала значнае ўцягненьне некваліфікаванае моладзі на вытворчасьці. Удзельная вага моладзі ў прамысловасьці ў агульным павялічылася. Таму сэкцыі Камінтэрну павінны зьвярнуць вялікую ўвагу на працу сярод пралетарскае моладзі. Між тым, мы часта наглядаем сярод камуністаў—працаўнікоў прафсаюзаў—імкненьне ўкласьці барацьбу моладзі выключна ў межы прафсаюзаў. У тойжа час прафсаюзы часта не дапускаюць у свае шэрагі моладзь, ці надаюць ёй абмежаваныя правы. Гэта прыводзіць да таго, што ў выпадку стачак рабочая моладзь, не ахопленая агульным калектыўным дагаворам, застаецца па-за барацьбою і прымушана альбо выступаць у ролі штрэйкбрэхэраў, альбо весьці барацьбу за свой страх і рызыку бяз санкцыі прафсаюзаў. У такіх выпадках кіраўніцтва барацьбой рабочае моладзі павінен узяць на сябе Камсамол. Ня менш важным пытаньнем для рабочае моладзі зьяўляецца небясьпека вайны. Праводзячы працу ўнутры арміі сярод мілітарызуемае моладзі, КІМ дамогся вялікіх посьпехаў. Але яшчэ вельмі слабая праца наша ў ваеннай прамысловасьці капіталістычных краін. Важнейшым пытаньнем рэвалюцыйнага руху моладзі зьяўляецца пытаньне аб арганізацыі моладзі ў калёніях. Для ацэнкі працы КІМ'у сярод новага пакаленьня моладзі вельмі характэрны даныя аб удзеле моладзі ў выбарах у Францыі і Нямеччыне. Выбары ў Нямеччыне, дзе было 2 з пал. міліёнаў маладых выбаршчыкаў, характарызаваліся значным удзелам пралетарскае моладзі. Посьпехі працы ў наяўнасьці. Прадстаўнік нямецкага камсамолу абран дэпутатам рэйхстагу. Аб працы КІМ'у і яго значэньні можна меркаваць і па стане сацыялістычнага Інтэрнацыяналу моладзі. Даволі зазначыць, што за апошнія 4-5 гадоў колькасны склад сацыялістычнага Інтэрнацыяналу зьменшыўся больш, чымся на палову, яднаючы ў сучасны момант каля 150 тысяч членаў. Міжнародная сацыял-дэмакратыя спрабуе выратаваць сацыялістычны Інтэрнацыянал моладзі, адшукоўваючы для яго новыя арганізацыйныя формы. Сацыял-дэмакраты цяпер ставяць пытаньне аб тым, каб арганізацыі рабочае моладзі, шляхам павбаўленьня іх палітычнага характару, ператварыць у чыста культурна-асьветныя арганізацыі. З гэтай тэндэнцыяй нам трэба змагацца ўсімі сродкамі. У буйна капіталістычных краінах, дзе камсамол працуе легальна,—у Нямеччыне, Францыі, Чэха-Славакіі, Злучаных Штатах, Аўстрыі і іншых,—колькасьць камсамолу з 1925 г. пачала зьменшацца. С пачатку 1926 г. колькасьць камсамолу зноў пачалала расьці і цяпер дасягла ранейшага ўзроўню, а ў некаторых выпадках і перасягнула яго. У краінах, дзе камсамол працуе нелегальна—ў наяўнасьці бурны рост камсамольскіх арганізацый. Асабліва вялікі рост кітайскага камсамолу. Нарэшце, у СССР камсамол з 1925 г. павялічыўся амаль у два разы. Неабходна згуртаваць сілы на тэй групе краін, у якіх колькасьць камсамолу амаль не павялічваецца. Палітычная лінія КІМ'у і яго сэкцый у апошнія гады за рэдкім выключэньнем была правільная. Камсамол ідзе па верным бальшавіцкім шляху. Неабходна на справе ажыцьцёвіць зазначэньне Леніна, што камсамол павінен быць масавай школай камунізму для рабочае моладзі, падрыхтоўчай школай да партыі. Намечаны новы курс,—гаворыць у канцы Шыльлер,—мы правядзём. Камітэрн можа і ўперад разьлічваць на камуністычную моладзь, як на адзін з сваіх лепшых і адважных атрадаў.

Прамова т. Люнцэнбэрга аб дзейнасьці Выканкому Камінтэрну.

МАСКВА, 20-VII. На пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну 20-га ліпеня першым у спрэчках па дакладу Бухарына аб дзейнасьці Выканкому Камітэрну выступіў Мюнцэнбэрг (Нямеччына). «Камінтэрн, — сказаў Мюнцэнбэрг,— абавязаў кампартыю весьці працу ў масавых арганізацыях. Аднак, нашая дзейнасьць і нашыя посьпехі ў гэтай галіне адносна малыя. Наша галоўная задача—прайсьці ў масавыя арганізацыі, якія знаходзяцца пад сацыял-дэмакратычным і буржуазным уплывам, заваяваць іх і ўмацаваць арганізацыі, далучаемыя да нас. Галоўная мэта нашае працы ў масавых арганізацыях—зацікавіць міліёны індэфэрэнтных рабочых палітычнай і эканамічнай барацьбой і арганізацыйна аб'яднаць рабочыя масы, спачуваючыя СССР. Мы павінны здолець выпярэдзіць нашых супраціўнікаў у стварэньні арганізацый, задавальняючых патрэбы мас. Існуючыя масавыя арганізацыі, далучаныя да нас, дамагліся ў сваёй працы буйных вынікаў. Аднак, у некаторых галінах мы яшчэ вельмі мала папрацавалі. Кангрэс павінен сур'ёзна заняцца праблемай масавае агітацыі, і даць адпаведныя дырэктывы Выканкому Камінтэрну і камуністычным партыям, каб з дапамогаю іх мы маглі заваяваць міліёны беспартыйных рабочых».

ДЭМАНСТРАЦЫЯ МАСКОЎСКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

Пасьля прамовы Мюнцэнбэрга Рэмэльле паведамляе, што да Дому Саюзаў прыбылі тры калёны маскоўскага пралетарыяту для прывітаньня кангрэсу. Па прапанове т. Рэмэльле, кангрэс пераносіць працяг спрэчак па дакладу т. Бухарына на наступнае пленарнае пасяджэньне, якое адбудзецца раніцою 23-га ліпеня, і дэлегаты накіроўваюцца насустрач дэманстрантам. На разгорнутых сьцягах і плякатах дэманстрантаў—лёзунгі: «Прывітаньне дэлегатам кангрэсу Камінтэрну—лепшым сыном рэвалюцыі,— Камінтэрн—магутны маяк на шляху сусьветнае рэвалюцыі»,—„Пралетарыі, усе на барацьбу з небясьпекаю вайны" і інш. Паяўленьне на бальконе дому Саюзаў т. т. Бухарына, Коларава, Сомара, Рэмэльле і інш. спатыкаецца гучнымі крыкамі „ура". У групе на бальконе выдзяляецца вэтэран рэвалюцыі, аўтар «Інтэрнацыяналу» т. Дэжэйтэр. Ён з захапленьнем дырыжыре агульным масавым хорам, выконваючым створаны ім рэвалюцыйны гімн сусьветнага пралетарыяту. Уздоўж фасаду Дому Саюзаў на імправізаваных трыбунах-грузавікох групамі сядзяць дэлегаты кангрэсу Камінтэрну, якія зварочваюцца да дэманстрантаў з прывітаньнямі і лёзунгамі на ўсіх мовах.

У дэманстрацыі ўдзельнічала ня менш 50 тысяч чалавек.

Гульня імпэрыялістаў у забароны вайны.

Трайная крытыка ангельскімі газэтамі дагавору аб „Забароне вайны".

ЛЁНДАН, 20-VII. Камэнтуючы ангельскі адказ Чэмбэрлена на ноту Колёга, кансэрватыўная „Морнінг Пост" піша: „З тэй прычыны, што дагавор ні да чаго не абавязвае, ён, як відаць, будзе прынятны для ўсіх і прынясе задаволеньне тым, хто шукае заспакаеньня ў словах і формулах". Газэта з сарказмам паказвае на імкненьне дзяржаў, заяўляючых аб прынятнасьці дагавора для іх, і падкрэсьлівае, што адмова ад вайны не распаўсюджваецца на абаронныя войны і на войны, якія вядуцца ў парадку выкананьня асаблівых абавязкаў. Газэта піша: „Мы пакладаемся на спрактыкаванасьць амэрыканцаў судзіць, ці дагавор вымагае пры наяўнасьці падобных абмоваи магчымасьці мабілізацыі арміі. Газэта напамінае, што ўсе дзяржавы, якія прымалі ўдзел у сусьветнай вайне, заяўлялі, што вядуць „абаронную вайну". Усе вялікія імпэрыі міравой гісторыі, якія заваявалі і затрымалі пад сваёй уладай калёніяльныя тэрыторыі,—гіранічна піша газэта—дасягнулі гэтага становішча, папросту абараняючы сябе ад нападу здрадзівых ворагаў. Напалеон абараняў сьвятую зямлю Францыі ў Маскве, ангельцы дзёрліся за сваё хатняе пыстаніцтва ў Канадзе. Цікава задаць пытаньне, як апынуліся самі Злучаныя Штаты ў становішчы валадароў Філіпінскіх выспаў?" Ліберальная „Манчэстэр Гардыан" задае пытаньне, наколькі шчыры дзяржавы, якія згаджаюцца падпісаць дагавор. «Усе ўрады—піша газэта—як і раней хаваюць арсэналы і ваенныя рэзэрвы. Ці-ж можна пагадзіць гэтыя акалічнасьці з адмовай ад вайны? Узбраеньні даводзяць, што ўсякі ўрад, згаджаючыся падпісаць прапанаваны Колёгам дагавор, сумняваецца ў шчырасьці іншых удзельнікаў дагавору. Падкрэсьліваньне гэтых сумніваў шмат якімі кіруючымі дзяржавамі—будучымі ўдзельнікамі дагавору—спрыяе тэхнічным адносінам к дагавору. Орган рабочай партыі „Дэйлі Гэральд" піша: „Нота Чэмбэрлена паўтарае абмоўкі, якія пазбаўляюць дагавор усялякай вартасьці. Падкрэсьліваньне права на самаабарону і цьвярджэньне, што кожная дзяржава ў стане рашаць, ці прымушаюць яе абставіны прыбегнуць к вайне,—усё гэта выбівае грунт з пад дагавору. Усякі ўрад можа ў любы час абвесьціць вайну, прыкрываючыся правам самаабароны і заяўляючы, што вядзе „абаронную вайну». Газэта падкрэсьлівае спасылку Чэмбэрлена на „вылучаныя райёны". Былы прадстаўнік Англіі ў Лізе Нацый, лёрд Сэсіль,—піша газэта прыпушчае, што пад гэтым «вылучаным райёнам» трэба разумець між іншым Афганістан і Аравію.

Можна з упэўненасьцю прыпушчаць, што пад гэтымі райёнамі трэба мець на ўвазе і нафтавыя землі ў Пэрсіі і Тыбэце. Магчыма, што пад гэтымі райёнамі разумеюцца і краі Кітаю. Фраза аб „вылучаных райёнах" гумовая: «ангельскі ўрад робіць від, што ўрачыста бярэ на сябе якіясьці абавязкі. У сапраўднасьці-ж абавязкаў ніякіх няма.

Крытыка дагавору амэрыканскімі газэтамі.

НЬЮ-ЁРК, 20-VII. Усе старанны Колёга абярнуць шматбаковы дагавор аб забароне вайны ў трыумф амэрыканскае дыплёматы і ў козыр для надыходзячае выбарчае кампаніі рэспубліканцаў, як відаць, пацярпелі фіяско. Тры кіраўнічых рэспубліканскіх органы «Нью Ёрк Геральд Трыбун», «Нью-Ёрк Ўэйнг Пост" і „Чыкаго Трыбун" востра крытыкуюць праэкт дагавору і ганьбяць задачу Колёга. Паводле думкі газэт, дагавор, нічога не даючы Злучаным Штатам, ушчвае іх у эўрапейскія канфлікты. Газэты прапануюць сэнату адхіліць ратыфікацыю.

У Саюзе ССР.

Праэкт бюджэту на 1928-29 г.

МАСКВА. Бюджэтным кіраўніцтвам НКФ СССР складзен пагоджаны з Дзяржплянам праэкт бюджэту на 1928-29 г. Бюджэт вылічан у 6970 млн. руб. Прамысловасьці электрафікацыі адпушчаецца 940 млн. руб. Сельскай гаспадарцы 255 млн. руб. супроць мінулагодніх 131 і шэсьць дзесятых млн. руб. Простыя падаткі ўзрастаюць на 9 проц., акцыцыя—на 13 проц., непадатковыя прыбытні—на 18 проц.

Наш адказ Чэмбэрлену.

Цэнтрасаюз пабудаваў 15 самалётаў.

МАСКВА, 19-VII. На пасяджэньні сходу ўпоўнаважаных цэнтрасаюзу з дакладам па пытаньнях бягучай гандлёвай палітыкі выступіў Наркамгандлю СССР т. Мікаян. У часе перапынку старшыня ў рабсэкцыі т. Пазднышоў паведамляе, што ў адказ на разрыў дыплёматычных зносін з СССР і Англіяй спажывецкая кааперацыя пабудавала на свае сродкі 15 самалётаў, якія яна перадае чырвонаму паветранаму флёту. Сход наладжвае бурную авацыю ўзыходзячаму на трыбуну камандзіру эскадрыльлі Талераву, які аддае рапарт аб прыбыцьці эскадрыльлі ў Маскву. Затым, ад імя вайскаў чырвонай паветранай флёты сход вітае камісар эскадрыльлі т. Макеляў. Па прапанове прэзыдыуму сход прымае пастанову даручыць управе цэнтрасаюзу прыняць шэфства над эскадрыльляй імя спажывецкай кааперацыі і ўважна сачыць за яе патрэбамі.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Рыхтуемся да асеньняга севу.

Магілеў, 21-VII. На апошнім пленуме АВК быў заслухан даклад загадчыка Акрэмадзелу аб выніках веснавое пасеўнае кампаніі і дырэктывах па асеньняму севу.

Пленум прапанаваў Акруговаму земаддзелу, сельска-гаспадарчаму саюзу і райвыканкомам, не паслабляючы тэмпу працы па калектывізацыі і кааперваньні насельніцтва, узяць рашучы напрамак да арганізацыі больш буйных калгасаў, праводзячы сталы падбор сацыяльнага складу іх і ўмацоўваючы калгасы ў гаспадарчым напрамку.

У сувязі з гэтым, арганізаваныя сёлета калгасы будуць у першую чаргу земляўпарадкаваны і пераведзены на шматпольны севазварот. Звернута будзе больш пільная ўвага на забясьпечаньне калгасаў гатунковым насеньнем, угнаеньнем і сельска-гаспадарчым інвэнтаром, асабліва буйнымі машынамі.

Прыняты крокі да правільнай арганізацыі рацыянальнага і поўнага скарыстаньня ўсіх зернаачыстных машын, як пракатных пунктаў, так і саўгасаў, КСУ і прыватных асоб.

Ачыстку насеньня наогул, супроць мінулага году, прадугледжана павялічыць на 27,6 проц.

У пляне асеньняй пасяўной кампаніі вызначан завоз: гатункованага жыта —74 тоны, пшаніцы—8,4 тоны і азімае вікі—4 тоны.

Для забясьпекі нармальнага правядзеньня пасяўной кампаніі будзе асыгнавана 30.000 рублёў на кредытаваньне бяднейшага насельніцтва, пацярпеўшага ад градабіцьця і іншых навалаў, а таксама і насельніцтва, якое прыступае да пасеву ў гэтым годзе ўпяршыню.

Вялікая палёгка беднаце.

Магілеў, 21-7. Прэзыдыум АВК зацьвердзіў пастанову прауленьня Магілеўскага акруговага таварыства сельска-гаспадарчага крэдыту аб сьпісаньні з бяднейшае часткі насельніцтва пазык, выдадзеных на ліквідацыю вынікаў стыхійных навалаў на суму 10755 р. 14 к.

Гэтае мерапрыёмства зьяўляецца вялікай палёгкаю для беднаты Магілеўшчыны, якая сёлета шмат пацярпела ад гураганаў і граду.

На пабудове с.-г. заводу.

Гомель, 21-VII. На пабудове новага сельска-гаспадарчага заводу скончана пляніроўка плошчы. Распачата капаньне катлавіны для фундаманту. Для будаўнічых рабочых пабудаваны інтэрнат, сталоўка і чырвоны куток. 29-га ліпеня адбудзецца ўрачыстая закладка заводу.

Пабудова амбуляторыі для рабочых фабр. „Двина".

Віцебск, 21-VII. Віцебскі інспэктарыят Аховы Здароўя распрацаваў праэкт і склаў каштарыс на пабудову новай амбуляторыі ў Пралетарскай-Слабадзе (быўш. Маркаўшчына).

Праэкт і каштарыс ужо зацьверджаны акрплянам і прэзыдыумам гарсавету.

Каштоўнасьць пабудовы вызначана ў суме 120.000 руб.

У бягучым годзе на пабудову амбуляторыі адпушчана з усесаюзнага лекавага фонду 25.000 руб.

Да пабудовы гэтай амбуляторыі мяркуецца прыступіць у бягучым годзе з тым, каб яе закончыць у 1930 годзе.

Выстаўка жывёлы.

Ворша. У сельска-гаспадарчым калектыве Пішчалава, Аршанскага раёну адбылася выстаўка лепшых гатункаў сельска-гаспадарчай жывёлы і розных прадуктаў ад яе. Выстаўка ахапіла савецкія, калектыўныя і сялянскія гаспадаркі Аршанскага раёну. Сяляне і гаспадаркі, якія прадставілі на выстаўцы лепшыя экспанаты, атрымалі прэміі ці дыплёмы.

У якасьці прэміі выдавалася жывёла палепшаных гатункаў, плугі, акучнікі і інш.

Першую прэмію—завадзкое парасё—атрымаў бядняк-селянін Фядот Загроўскі з хутару Ліпкі, які мае толькі адну дзесяціну зямлі.

Жыльлёвае будаўніцтва.

Бабруйск, 21,7. Бабруйскім саюзам жыльлёвай кааперацыі скончана пабудова другіх паверхаў над двума аднапавярховымі дамамі. Цяпер праводзіцца ўнутранае абсталяваньне гэтых дамоў і прыстасаваньне іх пад кватэры станцыя ў Багушэўскім, якая будзе абслугоўваць і рыбнакансэрвовы завод. На працягу 1928-30 г.г. намячаецца пабудаваць Горацкую станцыю на 200 кілёват, якая будзе абслугоўваць сельска-гаспадарчую акадэмію, млын, крахмальны завод, кансэрва-варачны завод, сельска-гаспадарчую рамонтную майстэрню і горад.

Апрача абслугоўваньня прамысловых прадпрыёмстваў у райённых цэнтрах—электра-энэргія гэтай станцыі будзе абслугоўваць таксама і вёскі ў 2-3-х вёрстным радыусе вакол станцыі.

Усяго на электрыфікацыю будзе затрачана 698223 р., мясцовых сродкаў—36,98 проц. і рэшта—цяржаўныя сродкі і крэдыты.

Попыт на аблігацыі пазыкі 27 году.

Гомель, 21-VII. У зьвязку з тыражом пазыкі 27 г. учора ў банкаўскіх установах быў узмоцнены попыт на аблігацыі пазыкі. Дзяржбанк прадаў аблігацый пазыкі на 30 тыс. руб. Каса ашчаднасьці прадала ўсе аблігацыі пазыкі, якія ў яе меліся і поўнасьцю задаволіла попыт. На значную суму прадаў аблігацый пазыкі Рабочы банк.

Новая электрастанцыя.

Барысаў, 21-VII. На пабудову электрастанцыі новае сярніковае фабрыкі адпушчана—256.250 р.

Сродкі будуць адпушчаны ў 27-28 годзе—65.000 р., 28-29—120.000 р. і 29-30—71.250 р.

За бязьдзейнасьць.

Дрыбіна, 21-VII. Групком саюзу савецкіх і гандлёвых служачых Дрыбінскага раёну за бязьдзейнасьць да тэрміну распушчан акруговым праўленьнем саюзу. Выбран новы мясцком.

Рост укладчыкаў кас адчад насьці.

Бабруйск, 21-7. У сучасны момант паштовыя касы ашчаднасьці яднаюць навокал сябе 8179 укладчыкаў з укладным капіталам у 333 тысячы рублёў. Павялічэньне ліку ўкладчыкаў ідзе, галоўным чынам, за кошт сялянства.

Падатак здаюць да тэрміну.

Глуск, 21-7. Селянін вёскі Германава Слабада, Глускага раёну, Бруяк Уладзімір, зьявіўся ў райвыканком і да тэрміну здаў належачы з яго сельска-гаспадарчы падатак у суме 20 р. Па яго прыкладу ідуць і другія сяляне.

Дабраахвотнае страхаваньне.

Магілеў. За мінулы год па акрузе паступіла грошай ад дабраахвотнага страхаваньня:

Па дабраахвотнаму страхаваньню ад агню—44.158 р.; ад падзяжу жывёлы —5337 р.; страхаваньню жыцьця—6904 р.

Пажараў у вёсках за гэты тэрмін адбылося 614. Па іх выплачана дзяржаваю 77.576 р. і яшчэ дадатковых —29248 р.

У гарадох было 13 выпадкаў пажараў і выплачана па іх страхоўкі 2759 рублёў.

Знойдзен скарб.

Ворша. У Горняй Веравойшы, Аршанскага раёну селянін Аксён Радкевіч выкрыў грашовы скарб у 7 фунтаў з срэбных і мядзяных манэт. Усе манэты часоў Яна Казімера, Сьцяпана Баторага, Жыгімунта III, Жыгімунта Аўгуста і інш.

Электрыфікацыя Аршаншчыны

6 новых электрастацый.

Ворша, 21-7. Апрач гіганта Асінбуду, у Аршаншчыне мяркуецца за пяць год пабудаваць цэлы шэраг дробных электрастанцый, якія ў некаторых мясцох будуць пабудаваны сумесна з другімі камбінаванымі прадпрыёмствамі: у 28-29 г. плянам намечана пабудова станцый у Лядах, Дрыбіне і Талочыне.

Станцыя ў Дрыбіне будзе абслугоўваць млын і крахмальны завод, станцыя ў Лядах будзе абслугоўваць ільнапрацоўчны завод, станцыя ў Талочыне—сельска-гаспадарчую рамонтную майстэрню.

У 1930-31 г. г. мяркуецца пабудаваць электрастанцыю з млынам у м. Расьне.

У 1931-32 г. г. будзе пабудавана

А. ШОТМАН.

ДРУГІ ЗЬЕЗД ПАРТЫІ

(*Успаміны*).

Я быў дэлегаваны на II-гі зьезд партыі пецярбурскім камітэтам. Да пачатку ліпеня зьехаліся амаль ўсе дэлегаты, частка з якіх, не заяжджаючы ў Жэневу, накіравалася проста ў Брусэль, дзе было пастаноўлена праводзіць зьезд. З шматлікіх нарадаў дэлегатаў, на якіх папярэдне абмяркоўваліся ўсе пытаньні парадку дню надыходзячага зьезду, выявілася поўнае аднадушша ўсіх прыехаўшых „іскраўцаў". Здавалася, што зьезд пройдзе дружна і не зацягнецца. З гэтым настроем пачалі дэлегаты невялікімі групамі разьяжджацца, каб спаткацца ў Брусэлі.

Па прыезьдзе ў Брусэль наша група спынілася ў готэлі, а праз некалькі дзён зьехаліся ўсе дэлегаты, апрача двух-трох, арыштаваных у Расеі, у ліку якіх, як мы даведаліся, быў арыштаваны трэці дэлегат ад Пецярбургу «Адэль»—Гольдман. Ён быў арыштаваны на самай граніцы, пры пераходзе праз яе.

Памяшканьне для пасяджэньняў зьезду далі нам бэльгійскія таварышы, галоўным чынам, прафэсыянальныя саюзы. Дапамагаў нам у гэты час і сучасны бэльгійскі міністр Вандэрвэльдэ. Памяшканьні былі вельмі нявыгодныя. Па канспірацыйных меркаваньнях пасяджэньні зьезду адбываліся ў розных частках гораду, пераважна ў рабочых райёнах.

Але нядоўга нам прышлося засядаць пры бэльгійскай канстытуцыі. Наколькі памятаю, удалося нам наладзіць усяго 4-5 пасяджэньняў, на якіх зьезд пасьпеў толькі з'арганізавацца і ўхваліць парадак дню ці, як тады гаварылі, «тагесордунг».

Аднойчы бэльгійская паліцыя прапанавала чатыром нашым дэлегатам—т.т. Землячке, Гусеву, Кнуніянцу і Зурабаву выехаць з межаў Бэльгіі ў 24 гадзіны. Чаму, за што—ніхто ня ведаў.

Езьдзілі па гэтай справе да Вандэрвэльдэ, але той таксама ня ведаў прычыны высылкі і абяцаў высьветліць і бараніць. З стараньняў нічога ня выйшла, і чатыром таварышом заставалася толькі сабраць манаткі і вымятацца з „вольнай" Бэльгіі. Здаецца, на пару дзён мы адцягнулі тэрмін выезду з Брусэля. Ужо адзін гэты факт шкодзіў працы зьезду, і паўстала пытаньне аб пераезьдзе ў другое месца. Але калі высьветлілася, што за рэштай дэлегатаў пачалася сьлежка, пастаноўлена было пераехаць зараз-жа.

Найбольш адпаведным месцам для працягваньня працы зьезду прызналі Лёндан; аб працягваньні-ж працы ў Брусэлі нельга было і думаць, бо сьлежка набыла самы адкрыты, наглы характар.

У Лёндан паехалі бяз усякай канспірацыі. Ехалі амаль што ў адным поезьдзе ўсе дэлегаты. Спачатку да Остэндэ, адтуль на параходзе ў Дуур, а з Дуура да Лёндану зноў па чыгунцы.

Жыўшыя ў Лёндане Аляксееў і Тахтароў з жонкаю загадзя знайшлі для нас памяшканьне, і ўсё наладзілася досыць добра. Гусеў, Сьцяпанаў, Красікаў, Андрэй і я паехалі проста ў памяшканьне Алексеева, які жыў дзесьці ў райёне Кінг-Крос. Тав. Алексееў жыў у Лёндане шмат гадоў, г а в а р ы ў добра па ангельску і зьявіўся для нас вельмі неабходным чалавекам, пазнаёміўшы нас са звычаямі і радкасьцямі Лёндану.

Пасяджэньні зьезду пачаліся на другі дзень пасьля прыезду. Зьбіраліся таксама як і ў Брусэлі, у розных частках гораду. Памяшканьні нам давалі прафэсыянальныя саюзы.

Аднойчы ў першыя-ж дні пасьля прыезду, пры выхадзе з аднаго пасяджэньня, вулічныя хлапчукі пачалі кідаць у нас гнілымі бульбамі і камкамі мокрай паперы. Чым гэта было выклікана, ня ведаю. Мабыць, ангельцаў абурыла гэтая разнастайная публіка, якая выходзіла з пасяджэньня, размахваючы рукамі, працягваючы на вуліцы спрэчкі, якія адбываліся на зьезьдзе.

А натоўп наш быў сапраўды разнастайны. Якіх толькі нацыянальнасьцяў і ўбраньняў ня было ў дэлегатаў. Адзін „Рашад-Бэк", Аршак Герасімаў-Зубароў, ужо нябожчык, чаго каштаваў, калі ён з прыроджаным каўказцам гарачым тэмпарамантам пачынаў на вуліцы пераконваць не падзяляючых яго думкі.

Калі мы, назаўтра, выходзілі з гэтага-ж памяшканьня, каля дзьвярэй сталі высокі ангельскі паліцэйн, як аказалася, пастаўлены па просьбе прафсаюзу спэцыяльна для аховы нашага зьезду.

Пасяджэньні зьезду адбываліся штодзень з раніцы да вечара з невялікім перапынкам на абед. Усяго было 37 пасяджэньняў. Зьезд цягнуўся каля месяца.

* * *

II-гі зьезд партыі зачынійся, раскалоўшыся амаль на дзьве роўныя часткі. Апошнія дні зьезду адбываліся ў надзвычайна гарачай атмасфэры. Справа ледзь не дайшла да рукапашнай і толькі ўмешаньне У. І. Леніна папярэдзіла скандал, ініцыятарам якога я ледзь-ледзь не аказаўся.

Здарылася гэта такім чынам.

Адзін з дэлегатаў яшчэ да адчыненьня зьезду, а пасьля ў пачатку яго ішоўшы ў шчыльным кантакце з групаю Плеханава і Леніна, да канца зьезду перайшоў на бок групы Веры Засуліч, Аксэльрода і інш. г. зн. будучых меншавікоў. Гэта мяне страшэнна абурыла. Ня вумеючы тады выступаць супроць яго словамі, я парашыў яго проста-напроста пабіць. Абурыла мяне ня толькі тое, што ўсяго якіх-небудзь два-тры тыдні таму назад па адным спрэчным пытаньні ён так красамоўна і пераконваюча гаварыў у абарону ленінскага погляду па гэтым пытаньні, што пераканаў ня толькі мяне, але і іншых рабочых-дэлегатаў—Сьцяпанава і Андрэя, якія ваг

Рыхтуемся да 25-гадовага юбілею II зьезду партыі.

(Гутарка з загадчыкам ГІСПАРТ'у ЦК КП(б)Б т. Агурскім)

Кампанія ў адзнаку II зьезду партыі ў БССР пачнецца з 30 ліпеня і працягнецца да 23 жніўня. У гэты-ж самы тэрмін, 25 год таму назад, адбываўся II зьезд партыі. Вось чаму ў гэты час мы і будзем праводзіць папулярызацыю II зьезду. На партыйных і рабочых сходах будуць пастаўлены даклады аб значэньні II зьезду, а таксама будуць наладжаны ўспаміны ўдзельнікаў сацыял-дэмакратычнага руху тэй эпохі.

Каб яшчэ лепш папулярызаваць рэвалюцыйны рух сярод шырокіх партыйных і працоўных мас, будзе выпушчана брашура т. Лепешынскага „В истоках большевизма", а таксама будзе выпушчана мая брашура «Очерки по истории революционного движения в Белоруссии». У апошняй брашуры будуць пералічаны ўсе этапы рэвалюцыйнага руху, пачынаючы з 1860-х гадоў і канчаючы 1917 годам. У гэтай брашуры таксама будзе аддадзена асаблівая ўвага тэй эпосе, у часе якой адбываўся II зьезд партыі.

Вось тыя арганізацыйныя мерапрыёмствы, якія намі часткай праведзены і часткай праводзяцца. У часе між 30 ліпеня і 23 жніўня наш друк павінен будзе аддаць шмат увагі гэтай кампаніі, каб шырэй азнаёміць усіх працоўных са значэньнем II зьезду.

Апрача гэтых мерапрыёмстваў, вялікую працу вядзе музэй Рэвалюцыі па падрыхтоўцы да 25-гадовага юбілею II зьезду партыі. Зараз музэй робіць папаўненьне матар'яламі аддзелу II-га зьезду партыі. Гэты аддзел павінен будзе паказаць удзельнікаў зьезду літаратуру, розныя дыяграмы, фатаграфіі і інш.

Нядаўна знойдзены матар'ялы ў магілеўскім папраўчым доме з эпохі часоў II зьезду. Гэтымі матар'ялямі зьяўляюцца дзьве брашуры. Адна— «Зборнік рэвалюцыйных песьняў» і другая— «Брашура Кауцкага". Гэтыя брашуры чыталі палітычныя зьняволеныя ў эпоху, калі адбываўся II зьезд. Апрача матар'ялаў, якія ўжо ёсьць па рэвалюцыйнаму руху ў эпоху II зьезду, намі вядзецца праца па далейшаму адшуканьню розных матар'ялаў, якімі будзе папаўняцца выстаўка, прысьвечаная 25-гадоваму юбілею II зьезду партыі.

Апрача гэтага, нядаўна атрымана з Масквы 80 брашур, якія былі выданы ў часе II зьезду.

Наогул, выстаўка на II зьезьдзе мае быць абсталявана добра і будзе дадзена магчымасьць усім працоўным навочна пазнаёміцца з працай II зьезду партыі і з рэвалюцыйным рухам.

Я. З.

Пра наёмную працу у сельскай гаспадарцы

(У парадку абмеркаваньня саюзнага зямельнага закона-праэкту).

Паводле сэнсу арт. 45 праэкту агульных асноў землякарыстаньня і землеўпарадкаваньня сялянская гаспадарка можа ўжываць наёмную працу на ільготных умовах толькі тады, калі яна не зьяўляецца кулацкаю, і калі ўсе працаздольныя члены гаспадаркі прымаюць удзел у яе работах. Ільготныя ўмовы для ўжываньня дапаможнае наёмнае працы сялянскімі гаспадаркамі ўстаноўлены выданымі 18 красавіка 1925 г. Саветам Народных Камісараў СССР часовымі правіламі. У іншых выпадках ужываньне наёмнае працы ў сельскай гаспадарцы рэгулюецца Кодэксам Законаў аб працы і выданымі ў яго развіцьцё распарадженьнямі.

Якія-ж выпадкі лічацца іншымі, калі ўжываньне наёмнае працы ў сялянскай гаспадарцы падпарадкоўваецца тым-жа правілам, што дзейнічаюць у савецкіх гаспадарках? Як відаць са зьместу праэкту агульных асноў, кулацкія гаспадаркі ня маюць права на ільготнае ўжываньне наёмнае працы. Потым правам на ільготнае ўжываньне наёмнае працы не карыстаюцца такія працоўныя земляробскія гаспадаркі, у якіх ня ўсе працаздольныя члены прымаюць удзел у сельска-гаспадарчых работах. Нарэшце, не павінны карыстацца тым-жа правам усе сялянскія гаспадаркі, якія прызнаны прамысловымі.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР за 29 сакавіка 1928 г. пра зьмену інструкцыі да часовых правілаў аб ужываньні дапаможнае наёмнае працы ў сялянскіх гаспадарках вызначае, якія з гэтых гаспадарак лічацца прамысловымі (Зб. Зак. № 13, арт. 114).

Што тычыцца да ўжываньня імі наёмнае працы, то паміж паасобных артыкулаў праэкту агульных асноў ёсьць, па нашай думцы, няўзгодненасьць, якую трэба зьнішчыць. Паводле арт. арт. 7 і 12 праэкту, усе грамадзяне надзяляюцца зямлёю для правільнага і мэтазгоднага вядзеньня на ёй сельскае гаспадаркі сваёю працаю. Трэцяя-ж частка арт. 45 тых-жа асноў дае права сялянскім гаспадаркам не працаваць на зямлі, абрабляць яе выключна праз батракоў і толькі абавязнае ў гэтым разе гаспадарку кіравацца Кодэксам Законаў аб працы. Выходзіць, што працоўная земляробская гаспадарка мае права страціць свой працоўны лад і зрабіцца гаспадаркай непрацоўнай.

Арт. 39 Зям. Код. дае права ўжываць дапаможную наёмную працу тым сялянскім гаспадаркам, усе наяўныя працаздольныя члены якіх прымаюць удзел нараўне з батракамі ў сельска-гаспадарчых работах. З арт. 45 праэкту агульных асноў слова „наяўныя" выкінута. Гэта дае падставу лічыць, што правам на ільготнае ўжываньне наёмнае працы не карыстаюцца такія сялянскія гаспадаркі, часова адсутныя члены якіх ня прымаюць удзелу ў гаспадарчых работах. Між тым арт. 16 Зям. Код. вызначае тэрмін, на працягу якога адсутны член двара не выключаецца з яго складу—і не патрабуе пры гэтым часовай яўкі адсутнага ў гаспадарцы. Да і па сутнасьці няправільным было-б пазбавіць гаспадарку права на ўжываньне дапаможнае наёмнае працы з-за таго, напрыклад, што член двара прызван на вайсковую службу, знаходзіцца далёка і ня можа атрымаць водпуску для ўдзелу ў палявых работах сваёй гаспадаркі.

Апроч тых пытаньняў, якія выклікае зьмест арт. 45 праэкту агульных асноў, трэба заўважыць, што самая рэдакцыя названага артыкулу выкладзенна няўдала і таму патрабуе паправак. Трэцяя частка гэтага артыкулу, напрыклад, пярэчыць першай, якая ўстанаўляе, што наёмная праца ў сялянскай гаспадарцы дапускаецца, як правіла, пры абавязковым захаваньні ўжываючай яе гаспадаркай свайго працоўнага ладу. У трэцяй-жа частцы арт. напісана, што ва ўсіх астатніх выпадках, а значыць і пры незахаваньні гаспадаркай працоўнага ладу ўжываньне наёмнае працы таксама дапускаецца, але рэгулюецца ўжо не часовымі правіламі, а Кодэксам Законаў аб працы. Выходзіць, што першая частка арт. устанаўляе для сялянскай гаспадаркі абавязак захоўваць працоўны лад, а трэцяя частка таго-ж артыкулу гэты абавязак касуе. Апроч таго, няўдалая рэдакцыя трэцяй часткі арт. 45 праэкту агульных асноў землякарыстаньня дае магчымасьць тлумачыць выкладзенае ў ёй правіла ў тым сэнсе, што кулацкая гаспадарка пазбаўляецца права на ільготнае ўжываньне наёмнае працы толькі тады, калі члены яе ня прымаюць удзелу ў сельскагаспадарчых работах разам з батракамі. Так можна разумець гэтую частку артыкулу з прычыны зьмешчанага ў ёй выразу: «Ва ўсіх астатніх выпадках і ў тым ліку». Значыць, правілы пра кулацкія гаспадаркі датычацца «астатніх выпадкаў», а ня тых, якія прадугледжаны першаю часткаю артыкулу, калі ўсе працаздольныя члены гаспадаркі выконваюць у ёй неабходныя работы. Між тым XV зьезд УсеКП(б) па дакладу т. Молатава прапануе «сачыць, каб няўхільна праводзіўся ў жыцьцё Кодэкс працы ў адносіне сельгаспрабочых у гаспадарках кулацкіх тыпаў». Гэтым кулацкія гаспадаркі пазбаўляюцца права на ільготнае ўжываньне наёмнае працы не ва ўсіх «астатніх выпадках», а ва ўсіх наогул выпадках.

Каб унесьці неабходную яснасьць у праэкт агульных асноў і не дапусьціць няправільнага яго ўжываньня, трэба з першай часткі арт. 45 выключыць слова «абавязковым», а пасьля слоў: «што ўсё» дадаць «наяўныя». Трэцюю-ж частку таго-ж арт. лепш было-б пачаць так:

«У сялянскіх гаспадаркх, прызнаных прамысловымі, а таксама ва ўсіх кулацкіх гаспадарках ужываньне наёмнае працы . . . «Тады арт. 45 будзе ўзгоднен з арт. 7 і 12 праэкту. Будзе ясна, што дзяржава дае, наогул, зямлю сялянам для працоўнага карыстаньня, але не забараняе ім падымаць вытворчасьць сельскай гаспадаркі, разьвіваць індустрыялізацыю і ўжываньне машын у гаспадарцы і паступова перарабляцца ў сельскія гаспадаркі прамысловага тыпу. Разам з тым зразумелым будзе, што толькі працоўныя земляробскія гаспадаркі маюць права на ўжываньне дапаможнае наёмнае працы паводле часовых правіл, выданых 18 красавіка 1925 г. Сялянскія прамысловыя гаспадаркі пры ўжываньні наёмнае працы павінны кіравацца Кодэксам Законаў аб працы, а гаспадаркі некультурныя пазбаўляюцца зямлі, калі яны страцяць свой працоўны лад.

Вішнеўскі.

ЗАГАТОЎКА ПЯНЬКІ ПРАХОДЗІЦЬ СЛАБА.

Пытаньне аб загатоўцы пяньки набыло самыя вострыя формы, пяньковая прамысловасьць у сучасны момант перажывае вельмі вострае становішча. Плян далёка ня выкананы, а многія фабрыкі і прыкалектывы ўсё чакаюць выкананьня пляну.

А лічбы гаворяць другое: на 1-га ліпеня сельска-гаспадарчая кааперацыя выканала ўсяго 49,4 проц., Белдзяржгандаль—46,7 пр., а спажывецкая кааперацыя—25,4 проц. Лічбы вельмі сумныя.

Наркамгандаль БССР заспакойўся і зьняў трывогу, але, нажаль, вельмі позна, калі ўзмацніць збор пяньки наўрад ці можна.

С.-г. кааперацыя павінна была загатовіць 480 тон, а ўсяго дала 237; Белдзяржгандаль павінен быў мінімум загатовіць 470 тон, а загатовіў 219 тон; пра спажывецкую-ж кааперацыю няма чаго і гаварыць, бо яна выканала ўсяго 25 проц. пляну.

Бясспрэчна, што акрганды на мясцох не прыкладваюць сур'ёзнай увагі на гэта пытаньне. Ліны сялянь і спакойна мараць. Яны зусім ня ведаюць як стаіць справа з дастачкай сыравіны прамысловасьці.

Водлуг нашай думкі, Наркамгандаль БССР мала інфармуе сваіх гандлёвых інспэктароў аб сапраўдным становішчы спраў, мала знаёміць іх са становішчам нашых фабрык. Гэта адно, а другое—кааперацыя, а таксама і Белдзяржгандаль у канцы сэзону аслабілі сваю працу, махнулі рукой. Гэта небясьпечны момант, які нагадваецца ня толькі ў адносіне да пяньки, але і да лёну, кудзелі, насеньня лёну і іншых відаў.

А зараз, калі мы стаім напярэдадні кампаніі гасдадарчага году, калі мы ў недалёкім часе павінны падагульніць вынікі нашай гадавой працы, трэба было-б усімі сіламі, усімі магчымасьцямі выкарыстаць усе рэсурсы, ахапіць сельска-гаспадарчыя рынкі поўнасьцю, што, на вялікі жаль, ня робіцца. Загатоўкам і акрганцыям трэба зараз у канцы сэзону ў некалькі разоў павялічыць сваю дзейнасьць, каб уступіць у новы гаспадарчы год з багатым багажом.

А. Манін.

Праверка—самакрытыка—кантроль мас.

ДЫПЛЁМАТЫ З МАГІЛЕЎСКАГА КАМГАСУ.

Хітры народ сядзіць у Магілеўскім аддзеле камунальнае гаспадаркі,—аднім чынам дыплёматы.

Асыгнавалі Магілеву адпаведныя сродкі на грамадзкія работы. Раз грошы ёсьць, дык трэба матар'ялы набыць, а разам з тым інвэнтар той ці іншы закупіць.

Які інвэнтар патрэбен для грамадзкіх работ?

Вядомая рэч, лапаты, зямлі, ну і іншыя інструманты для рабочых.

Гэта набываецца па ўсіх округах, а вось магілеўскія камгасаўцы пачалі разважаць.

— Дарогі і масты рамонтуем? Рамонтуем... Дарогі гэтыя маюць адносіны да Аўтадору? Маюць, бо Аўтадор мабілізуе грамадзкую думку і ініцыятыву ў справе падняцьця культуры нашых дарог.

Правільна разважаеце, таварыш,—падтрымаў тэхніка загадчык камгасу.

А вэлёсыпэды адносіны да Аўтадору маюць? Ня толькі маюць, але іх праз ячэйкі Аўтадору толькі і можна набыць.

Добра. Значыцца набываем для грамадзкіх работ два вэлёсыпэды.

Сказана зроблена, і за сродкі, што прызначаны на барацьбу з беспрацоўем, Магілеўскі камгас набыў 2 вэлёсыпэды.

Так магілеўцы разважалі пры пакупцы вэлёсыпэдаў, а што гаварылася пры набыцьці за сродкі грамадзкіх работ партфэлю, дык тут можна толькі гадаць.

Мусіць так разважалі магілеўцы—кіраваць работамі трэба? Трэба. Кіраўнік без партфэлю, ці ён будзе кіраўніком? Вядома, які-ж ён кіраўнік... Нават без партфэлю і пашаны яму ня будзе...

Правільна, значыцца набываем і партфэль. Заплацілі адпаведныя грошы і партфэль ужо эксплёатуецца!..

* * *

Усыпаць за нерацыянальна выкінутыя грошы могуць?

Могуць,—адказвае працаўнік камгасу загадчыку апошняга.

Выхад з гэтага становішча можна знайсьці?

Можна... Складзём сьпіс інвэнтару грамадзкіх работ і накіруем у Наркамправы, а раз апошні гэтага нават не патрабуе, дык і глядзець ня будзе. А калі ня будзе глядзець, дык і апратэставаць пакупкі вэлёсыпэдаў і партфэлю ня будзе. А калі не апратэстуе, дык пры рэвізіі скажам, што Наркамправы дазволіў,—даваў, відаць, нехта парады загадчыку Магілеўскага камгасу.

Добра, так і зробім.

Усё было-б добра, але ня ўлічылі нашы дыплёматы, што ў Наркамправы зацікавяцца іх тонкім ходам.

І за такое скарыстоўваньне сродкаў, асыгнаваных на барацьбу з беспрацоўем, нашых дыплёматаў напаўна на галоўцы не пагладзяць.

В. Зайцаў.

Аўгіевы стайні.

...Мы расьцём—гэта ўсім вядома. У нас будуюцца вялікія камяніцы, праводзіцца каналізацыя, у горадзе арганізуюцца новыя сквэры, сады. Адным словам, ва ўсім адчуваецца нясупынны рух, бадзёрасьць і непераможнае імкненьне перабудаваць наша жыцьцё на новы, культурны лад...

Так гаварыў прадстаўнік менскага камгасу на адным сходзе, падагульваючы дасягненьні калгасаўскага будаўніцтва.

Хто маўчаў, а хто і зусім драмаў. Але, адзін, нейкі мэлянхалічны чалавек, недаверліва пакруціўшы галавой і зьвярнуўшыся да мяне, сказаў таемна: «Ня верце яму, г. зн. прамоўцу, ён, муся-быць, ніколі ня быў на акраінах, і, бадай, нават ні разу не наведаў гарадзкі сад. Вось тады загаварыў-бы ён інакш.

— Вы ня верыце мне,—працягваў мэлянхалічны чалавек, угледзіўшы маю скептычную ўхмылку,—балазе зараз цёпла, пойдзем, паспацыруем і я пазнаёмлю вас з нашым «дабрабытам», як ён выглядае ў сапраўднасьці.

Упэўнены ў тым, што мэлянхалічны чалавек ня выскрабе хібаў у працы камгасу, я, як актыўны член гарсавету, рашыў пераканацца ў гэтым, і павольна пацягнуўся ў гарадзкі сад.

Зразумела, уперад мы апынуліся ў зялёных прысадах: усюды зеляніна, прыгожы хмызьнячок, скошаная трава перанесла мяне ў палёвыя прасторы. Я ішоў у задуменьні, падымаючыся на нейкую горку. Але... раптам я абудзіўся і зусім не паэтычна.

Хоць і шаную вас вельмі, дарагі чытач, але мушу сказаць, што гэты „дух" (па простаму смурод) густа цягнуўся ад уборнай, якая воддаль стаяла ў садзе. Я пакруціў носам і хацеў павярнуць лыжы назад, але мэлянхалічны чалавек упарта цягнуў мяне за палу.

— Ну, што бачыце,—гаварыў чалавек,—ніхто нават не паклапоціцца, каб паліць тут чым-небудзь, ці пасыпаць пяском. Гэтыя «Аўгіевы стайні», мусібыць ніколі і ня чысьцяць...

...Мэлянхалічны чалавек стаяў каля мяне і паказваў мне на гаматную (грамодакае) будову мосту праз Сьвіслач.

Я з упэўненай усьмешкай, што мой падарожнік сядзе тут макам у сваіх абвінавачваньнях, заўважыў яму:

— Цяпер вы бачыце ўжо, што камгас дбае аб нашым дабрабыце..., але я анямеў, гледзячы туды, куды паказваў рукой мэлянхалічны чалавек: пад мастом, каля цэмантовых паляў ляжалі здохлыя сьвіньні, кошкі і інш. нязграбныя рэчы.

— І вы думаеце, што толькі тут антысанітарнае становішча Сьвіслачы, —з абурэньнем у голасе гаварыў мэлянхалічны чалавек,—не, уздоўж усёй ракі, усюды вы можаце ўбачыць кучы гною, усялякую заразу, якая псуе паветра, заражае ваду. І трэба толькі падумаць, што ў раце купаюцца людзі, мыюць бялізну.

Мы пашлі назад. Я маўчаў усю дарогу.

К. І.

Чакаем слова рэвалюцыйнай законнасьці.

Знайшоўшы сабе прытулак ворагі савецкай улады ў магазынах Горацкага спажывецкага таварыства прыблізна год назад былі зьняты з працы. Але ў сучасны момант зноў там прымасьціліся, ня гледзячы на тое, што былі пад судом і што самі пайшчыкі пастанавілі зьняць іх з працы і аддаць пад суд за недахват тавараў у магазынах. Зразумела, Левіну відней. Ён старшыня спажывецкага таварыства. Ну, а грамадзкая думка, савецкі друк і думка пайшчыкаў—гаспадароў каапэратыву, гэта для яго нічога. Калі горацкі пракурор маўчыць, значыцца ўсё добра.

Вось кароткая гісторыя аб гэтых людзях-гандлярох. Чым яны былі раней і чым зараз. Шапіра быў лёкаем горацкага буржуя Падзерскага і гэты лёкайскі дух захаваў да гэтага часу. У яго жыве Левін, і вось як удзячны кватарант, Левін назначыў Шапіру загадчыкам магазыну, дзе пры рэвізіі ў мінулым годзе выкрыта недастача і Шапіра быў аддадзен пад суд. Справа зацягнулася і Шапіра якійсьці спосабам апынуўся на волі і ў сучасны момант Левін зноў узяў яго на працу і назначыў яго загадчыкам хлебным магазынам. Як-жа не дапамагчы гаспадару памяшканьня і ўслужліваму лёкаю.

Сорын—жыхар Рагачэва. Маюцца весткі, што ён сваяк жонкі Левіна. Левін, прыехаўшы ў Горкі, выпісаў яго да сябе і назначыў загадчыкам магазыну. Апошні таксама ўчыніў растрату, быў зьнят з працы і аддадзен пад суд за значную недастачу і за няправільную вагу пры водпуску тавараў. Яго ўлавілі на гэтым злачынстве, але здаецца суд і яго памілаваў, бо Розэнгауз ня лічыў патрэбным падтрымаць абвінавачаньне супроць Сорына, будучы ў судзе. Як відаць красьці з грамадзкіх крам і недавешваць тавары не зьяўляецца заганай. У сучасны момант Сорын зноў працуе.

Ратноўскі—выдатны багацей мінулых часоў, прымаў актыўны ўдзел разам са сваімі сынамі ў контр-рэвалюцыйных выступленьнях у Горках, аб чым ведае ўся грамадзкасьць, ведае пракурор і яшчэ нехта, каго гэта датычыцца. У сучасны момант ён працуе на пасадзе загадчыка магазыну.

Пра гэта ўсе гаворыць, усе ведаюць. Пра гэта няраз гаварылі ў савецкіх і партыйных органах райёну. Але рэвалюцыйная законнасьць чамусьці гэтага ня бачыць. Відаць, нешта засланяе вочы горацкім кіраўнікам і абаронцам рэвалюцыйнай законнасьці. Час-бы ўжо з гэтым злом скончыць і даць усім вінаватым адпаведнае месца і шчыра падзякаваць пракурору Розэнгаузу (хоць ён вельмі малады як па працы, так і па ўзросту) за яго дбайныя адносіны да рэвалюцыйнай законнасьці.

Наглядзўшы.

9 капеек у суткі.

— Кальянаў, сябра Лядненскага РВК і інспэктар асьветы, мае ўласную гаспадарку, на якой жыве, але не працуе, сам Кальянаў для працы на гаспадарцы наймае батрачку. Наняў ён з в. Казьян гр-ку Багуновіч і жонцы загадаў:

— Глядзі, дагавору толькі не заключай.

Батрачка Багуновіч хацела заключыць дагавор, але жонка Кальянава адмовілася, кажучы:

— На табе вазіць ваду ня будзем—конь ёсьць.

А ў выніку аказалася, што ўсё-ж ваду посіць на сабе Багуновіч і пад вельмі крутую гару.

Кальянава прапанавала Багуновіч за год 30 руб.—батрачка дала згоду. Згадзілася і пасьля сама ня рада. Багуновіч і ваду насіла пад гару, секла дровы, прала, мыла падлогу, бялізну і г. д.

Ёсьці батрачцы часам не давалі.

Вось як працавала Багуновіч і за гэта атрымлівала па 9—10 кап. у дзень.

Ці прыгожа гэтак рабіць інспэктару асьветы? За гэткае злачынства Кальянава чакае нарсуд. Яму прыпісаны 133 арт. К. К.

С.

ТЭАТР КАБУКІ.*)

СНК БССР пастанавіў запрасіць у Менск на гастролі японскі тэатр Кабукі. Прыезд японскага тэатру ў СССР зьяўляецца ўзмацненьнем культурнае сувязі паміж Савецкім Саюзам і краінай Усходу—Японіяй. У Японіі аб нашай савецкай літаратуры ведаюць. Японія мае пераклады амаль усіх больш менш вядомых пісьменьнікаў СССР. Ня гэтак даўно ў Японіі была арганізавана выстаўка твораў савецкіх мастакоў. Дзесяткі паасобных культурных дзеячоў Японіі наведвалі Савецкі Саюз. Ня гэтак даўно мы на Беларусі бачылі вядомага пісьменьніка Акіту. Зараз у СССР прыяжджае з Японіі тэатр Кабукі. Прыезд да нас японскіх гасьцей, а таксама і тэатру мы павінны выкарыстаць для больш глыбокага вывучэньня культуры далёкае Японіі.

КАОРЫ АСАНАЙЯ.

дырэктар і рэжысэр Цукідзі (малы тэатр) у Тоніо.

Вось чаму мы карыстаемся выпадкам, каб пазнаёміць чытача з тэатрам Кабукі і наогул тэатральным жыцьцём Японіі. Зараз японскі тэатр, як і наогул усё мастацтва Японіі, перажывае той час, калі на культурную арэну Ўсходу выходзіць эўрапейская культура. Гэта культура ідзе на зьмену старой культуры, утворанай японскім народам. У тэатры ўжо адбыліся плыні Захаду—зьявіўся эўрапеізаваны тэатр, Цукідзі (малы тэатр), у якім рэжысэрам працуе вучань Станіслаўскага—Каоры Асанайя. Асанайя прынёс у японскі тэатр шмат чаго з расейскіх тэатраў Станіслаўскага, Мейерхольда і іншых.

Цукідзі тэатр расьце з кожным годам. У яго рэпэртуары вы знойдзеце п'есы эўрапэйскіх тэатраў. Але побач з ім існуе яшчэ старажытны тэатр НО—адзін з самых старажытных тэатраў на зямлі. Тэатр НО—гэта тэатр японскага шляхоцтва, тэатр містыкі і рэлігійнасьці.

Тэатр Кабукі—гэта сапраўдны народны тэатр Японіі. Японцы вялікія тэатралы. У Японіі няма чалавека, які-б ня быў у тэатры, асабліва ў Кабукі тэатры. Кабукі карыстаецца ў Японіі вялікай пашанай.

Кабукі нарадзіўся ў той час, калі ўжо існаваў тэатр НО, які фактычна зьяўляўся тэатрам вышэйшых колаў. Кабукі тэатр утварыўся самім народам у фэадальны час.

Амаль што ў самую пару росквіту Кабукі—урад забараніў тэатру гастролі таму, што «лёгкая» ігра жанчын „маральна разлагала юнацтва".

Але праз некалькі год Кабукі ізноў зьявіўся, але ўжо без жанчын, а толькі з акторамі-мужчынамі, якім прыходзілася граць жаночыя ролі. Гэтая традыцыя захавалася і па сёнешні дзень.

Праўда, у апошні час рабіліся спробы ўвесьці ў склад тэатру жанчын, але пакуль што гэтая спроба была адзінкавая і посьпеху ня мела. Яна была наватарствам, якога не шануе Кабукі тэатр.

Кабукі тэатр ведае некалькі вялікіх дынастый актораў, якія сьвята захоўвалі традыцій сваёй дынастыі і перадавалі з роду ў род.

У апошні час званьне актора ў Японіі зрабілася начэсным, актора лічаць нацыянальным гэроем.

З боку афармленьня пастаноўкі тэатр Кабукі мае свае асаблівасьці.

На сцэне Кабукі няма такіх дэкарацый, як у нас, там замест іх сапраўдныя рэчы, сапраўдныя будынкі, дрэвы і інш. Таму, што сцэна круціцца, яна дае магчымасьць хутка зьмяняць дэкарацыі. Сцэна Кабукі тэатру ідзе ў залю ў выглядзе г. зв. «ханаміцы»—шляху кветак, якае мае вялікае значэньне для тэатру, бо яна замяняе сцэну ў той час, калі на сапраўднай сцэне ідзе зьмена дэкарацый, якую робяць працаўнікі сцэны, апранутыя ў чорную вопратку, каб быць няпрыкметнымі. Ён, гэты сцэнічны служачы ўвесь час знаходзіцца на сцэне, але яго не павінны бачыць гледачы і праўда японцы ўжо так прызвычаіліся да яго, што не заўважаюць яго прысутнасьці на сцэне. На «дарозе кветак» адбываюцца дзеі, дзе паказваюцца паходы, прасьледваньні і інш. Само памяшканьне тэатру Кабукі падобна да нашых, але ў некаторых тэатрах ёсьць часамі асобныя месцы, дзе гледачы сядзяць на цыноўках, нібы дома. Заслон у японскім Кабукі тэатры няма, дзеі пачынаюцца выхадам актораў па «дарозе кветак». Гэты выхад папераджаюць: сьпевакі і музыканты, граючыя на асобных струментах, якія называюцца «сямісэнамі». Сьпевакі і музыканты знаходзяцца ўвесь час на сцэне.

Сцэна з п'есы «Натка Мура»

Самае каштоўнае, што нам дае тэатр Кабукі—гэта ігра актораў. Акторы Кабукі самыя лепшыя акторы. Іх ігра—мастацтва, якое выкрышталізавалася ў працягу стагодзьдзяў. Актор перадаваў лепшаму з сваіх вучняў сваё званьне і сваю манэру ігры.

Трэба адзначыць, што Кабукі тэатр мае некалькі актораў, якія сваёй ігрой жаночых роляў сталі вядомымі па ўсёй Японіі... Сярод іх найбольш вядомымі зьяўляюцца актор Утаэмон, 74-х гадовы актор, які з вялікім посьпехам грае і цяпер ролі маладых дзяўчат. Аноэ Кікугоро, Сьё, Шочыё, Амэзо—вось найбольш папулярныя «аннагата» Кабукі тэатру. Ігра актораў «аннагата», а таксама і наогул усіх актораў дасягае дзіўнае дасканаласьці.

Рэпэртуар тэатру складаюць п'есы, напісаныя акторамі і па свайму зьместу падзяляючыся на «сэумоно»—бытавыя камэдыі і драмы і «зівайдмоно» п'есы і драмы гістарычнага і гэраічнага зьместу. Усе гэтыя драмы носяць адбітак нечага рамантычнага, баечнага, у значнай меры сымбалічнага. У Японіі тэатр Кабукі карыстаецца вялікай пашанай.

Яшчэ нядаўна Кабукі—тэатр граў ад 12-ай гадзіны раніцы да 12-ай гадзіны ўночы без перапынку. Цяпер ён грае ад 3-ай гадзіны. У тэатры заўсёды поўна. Прыяжджаюць і з вёсак. Для прыяжджаючых каля памяшканьня тэатру пабудаваны асобныя дамы. Кабукі тэатр замяняе японцу кіно.

Прыезд тэатру ў БССР яшчэ больш павінен узмацніць тую сувязь, пачатак якой паклаў Удзяку Акіта—драматург і пісьменьнік тэатру Цукідзі (малы тэатр).

Шчырае прывітаньне Кабукі ў Менску!

Зм. С.

*) За матар'ялы прыношу падзяку тав. Удзяку Акіта.

НАТАТКІ ПРА УКРАІНУ*).

Стомленыя за бяссонную, памятную ноч у Каніве, якая, бязумоўна, будзе абавязкова выкарыстана кім-небудзь в удзельнікаў нашай экскурсіі, як цікавы ўрывак для прыгодніцкага апавяданьня з псыхалёгічнымі перажываньнямі гэрояў—усе чыста прыціхлі, замарыліся, блукаюць на прыстані, углядаючыся ў Дняпро...

Нарэшце, а чацьвертай гадзіне раніцы доўгачаканы параход прарэзьлівым сьвістам сыроны дае чуць аб сваім прыбыцьці на прыстань...

Едзем у Днепрапятроўск...

Пасажыраў—бітком набіта. Няма нават дзе прысесьці. У пераважнасьці едуць сяляне, выходзячы з параходу на маленькіх прыстанях... Мы слухаем жывую, украінскую мову.

Салодкі пах спаранай ад гарачыні цыбулі да ташнаты казыча ў носе. Грузіцца мука, і хмары пылу асядаюць на твайм адзеньні. Відаць тут вялікі рух і вялікія грузаабароты. Палубы няма, і мы тулімся на носе „Камунара". Сьпяваем, гутарым, я нават лекцыю аб сучаснай Беларусі прачытаў нашым спадарожнікам—экскурсіі харкаўскіх школьнікаў.

У сьпякоце, цеснаце, бяздзейнічаньні праходзяць цэлыя суткі—ад Каніва да Днепрапятроўску...

Шырокі, прасторны, сталічных намераў, малады Днепрапятроўск...

Днепрапятроўск — сталёвае сэрца Украіны. Дымам акутаны, увесь у высачэзных трубах, невялічкая, запыленая расьлінасьць, шырокія, пустыя вуліцы,—такім мы ўгледзелі Днепрапятроўск.

Дзьвесьці восемдзесят тры тысячы жыхароў, з якіх восемдзесят тысяч рабочых—ужо гэтыя лічбы кажуць аб Днепрапятроўску, як пралетарскім асяродку Украіны.

Зусім малады Днепрапятроўск. Яму ня больш двухсот, ці каля гэтага гадоў. Узрост гораду залежыць ад жалезнай руды, якая нязьлічонымі запасамі хаваецца ў петрах днепрапятроўскай зямлі, і горад вырас разам з разьвіцьцём прамысловага капіталізму ў былой Расеі, заняўшы першае месца ў здабычы жалезных руд і іх апрацоўцы ў жалеза, сталь, чыгун...

Пыл у Днепрапятроўску цяжкі жоўты, і нават, як мне здаецца, паветра аддае пахам іржы...

У адрозьненьне ад Кіеву, ад Каніву, у Днепрапятроўску пераважае расейская гутарка.

У Днепрапятроўску багата жыве рускіх рабочых, а украінскі рабочы зрусіфінаваны—так нам растлумачылі нашы украінскія таварышы.

— Ну, а як тут украінізацыя?—пыталіся мы.

— Слаба... было адказам.

Бязумоўна, ніхто з нас не разумеў пад тэрмінам «украінізацыя»—украінізацыю рускіх рабочых, як нацыянальнай меншасьці. Пад тэрмінам «украінізацыя» мы разумелі перавод працы партыйных і савецкіх установ Днепрапятроўскай акругі на украінскую мову, правядзеньне масавай працы сярод украінскіх рабочых на украінскай мове, карыстаньне украінскай літаратурай...

Мы мелі суадносіны з Днепрапятроўскім акругкомам камсамолу. Па тэй сустрэчы і гутарках з украінскімі нашымі таварышамі, па тым няведаньні і паўнейшаму незнаёмству камсамольскіх агітпропшчыкаў(!) з сучаснай украінскай літаратурай—у адрозьненьне ад кіеўскіх акругкомаўцаў, па няведаньні камсамольскімі апаратчыкамі украінскай мовы мы ўпэўніліся ў тым, што яшчэ пакуль што «слаба».

Мы даведаліся, што ў Днепрапятроўску апаратчыкі—камсамольцы нават зрывалі выступленьні украінскага «Молодняка» перад камсамольскай масай, і толькі дзякуючы націску, нашым украінскім сябрам удалося выступіць і быць радасна сустрэнутымі камсамольскай масай, у адрозьненьне ад сустрэчы з акруговымі камсамольскімі працаўнікамі...

... З цэнтру трамвай імчыць вас на край горада Едзем даволі доўга—гэта кажа аб вялікай, параўнаўча, адлегласьці заводу імя Пятроўскага ад цэнтру гораду.

Перад намі дымавая заслона... Трамвай ідзе нібы на туману. Малочна-блакітная дымка засьцілае вуліцу... Праворуч выплываюць вялічэзныя трубы жалеза-ліцейнага заводу імя Пятроўскага. І многа іх!

— Раз, два, тры, пяць, восем, дзесяць—нехта з нас бярэцца лічыць высачэзныя стромкія волаты—трубы домн.

А яны нібы дышуць чорным дымам, пыхцяць агнём, як таныя парам і цэлае воблака на дзесятку вёрст распасьцерлася па-над гарадам...

Ужо знадворку гэтая веліч вогненных труб, у адрозьненьне ад прыгожых, спакойных і ціхіх узгор'яў Падняпроў'я, у адрозьненьне ад кучаравага стэпу з сочна-зялёнай, раскошнай травой,—прыбівае нашыя пачуцьці, давіць грудзі сваёй чарнатою, і перамешаным з дымам пылам жалезнай руды... Грудзі здаўлены, ты адчуваеш чалавечую бяспомачнасьць і ў той-жа час магутнасьць чалавечага розуму! Вось яна, індустрыя, Вось яна індустрыя, што нясе за сабою шчасьце чалавецтву ў наш век!

Жалеза!—Гэта ты разам з бэтонам робіш сваю справу цывілізацыі чалавецтва....

Жалеза! Рэта ты скоўваеш думку тых, хто працуе над табою ў адзін моноліт, моцны і цьвёрды. За гэта кахаю, жалеза, цябе...

Трамвай спыніўся, і мы ля варот заводу. Цяпер якраз зьмена, і мы бачым, як соткі, тысячы рабочых ідуць на працу. Вось, яны тыя, хто плавіць руду і робіць з яе чыгун, жалеза, сталь, хто робіць машыны, трактары, масты...

— Вітаньне! Вітаньне вам!

Чакаем ля фортку, покуль прыдзе малады інжынэр-практык—экскурсавод па заводу.

Нарэшце т'кі мы ўваходзім у вялічэзны запылены двор. Усюды рабочыя,—дзе ні глянь. Вось наплывае цягнік з ваганеткамі, а ў ваганетках—жалезная руда. Рабочыя ссыпаюць у кучы... Вось тут побач-жа стаіць група другіх рабочых і вялічэзнымі шуфлямі—лапатамі насыпае гэтую-ж руду ў другія ваганеткі, якія ходзяць па падземных хадох...

Вось ваганетка трапляе ў ланцугі, і невядомая сіла ўзьнімае высока, высока яе; акуратненька падводзіць да доменнай печкі і... перакульвае... Сырая, чырвоная жалезная руда трапляе ў печку, дзе ўжо бурліць і клякоча пры паўтаратыс

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

аб зьняцьці з тав. Угарава, Н. Р., абавязкаў сакратара СНК і Намесьніка Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР.

У зьвязку з пераходам тав. Угарава, Навума Рыгоравіча, на працу па лініі Народнага Камісарыяту Юстыцыі, зьняць з яго, згодна яго просьбы, абавязкі Сакратара СНК і Намесьніка Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карпін.**

Кір. Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Мароз.**

9 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену складу Калегіі пры Народным Камісары Асьветы БССР.

На зьмену сваёй пастановы за 8 лютага 1928 г. «Пра склад Калегіі пры Народным Камісары Асьветы БССР» (З. З. БССР 1928 г., № 10, арт. 80), Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1) Зьняць з т. Вансоўскага, Браніслава Антонавіча, абавязкі члена Калегіі пры Народным Камісары Асьветы.

2. Назначыць т. Паўлюкевіча, Алеся Іванавіча, і Шастакова, Паўла Пятровіча, членамі Калегіі пры Народным Камісары Асьветы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Мароз.**

4 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

ЮРЫДЫЧНАЯ ДАПАМОГА ПРАФСАЮЗАЎ

За першае паўгодзьдзе г.г. у Юрыдычную Кансультацыю ЦСПСБ было 3374 зваротаў за юрыдычнай дапамогай, што складае ў сярэднім 562 звароты ў месяц. Пераважная большасьць зваротаў зьвязана з працоўнымі справамі. Тут трэба адзначыць усялякія непаразуменьні, зьвязаныя з заработнай платай, прыняцьцем і зьвальненьнем, аховай працы і г. д. Трэба зазначыць, як на зьявішчы базуюўна вялікай важнасьці, што за апошнія некалькі месяцаў звароты па пытаньнях звальненьня значна скараціліся.

Наступнай групай зваротаў зьяўляюцца пытаньні, зьвязаныя з жыльлёвымі справамі. Жыльлёвыя пытаньні, як вядома, найбольш вострыя. І таму гэта пытаньне знайшло поўны адбітак у практычнай працы Юрыдычнай Кансультацыі ЦСПСБ.

Вельмі характэрна, што параўнаўча вялікі процант займаюць звароты ў кансультацыю па сямейных справах, а таксама па справах крымінальных (крымінальныя справы ў большасьці адносяцца да катэгорыі дробных крымінальна-бытавых спраў, як пабоі, зьнявага, паклёп і г. д.). Гэта сьведчыць аб бясспрэчнай папулярнасьці юрыдычнай кансультацыі ў шырокіх масах членаў саюзаў, якія ідуць у кансультацыю ня толькі па пытаньнях, зьвязаных з парушэньнем розных момантаў іх працоўных узаемаадносін, але таксама па пытаньнях чыста асабістых, унутранага жыцьця.

Судовых выступленьняў за справаздачны перыяд часу было 82. Колькасьць выступленьняў сёлета крыху скарацілася ў параўнаньні з мінулым годам. Тлумачыцца гэта тым, што 1-я ўсебеларуская нарада юрысконсультаў прафсаюзаў выказалася за выступленьне ў судзе толькі па тых справах, дзе прафсаюз лічыць неабходным падтрымаць працоўнага і выказаць свой пункт погляду на яго справу, а таксама па справах найбольш складаных і спрэчных, дзе ўдзел кваліфікаванага юрыста сапраўды неабходны.

Ставячы сабе мэтай набліжэньне юрыдычнай дапамогі да працоўных, юрыдкансультацыя не абмяжоўвалася аказаньнем юрыдычнай дапамогі непасрэдна ў ЦСПСБ. Для гэтай мэты ўстаноўлены сыстэматычныя дзяжурствы юрысконсультаў у Працоўнай Сэсіі ў дні судовых пасяджэньняў. Гэта мерапрыёмства дае вельмі добрыя вынікі, бо працоўны адразу вырашае ўсе падрабязнасьці сваёй справы, пачынаючы ад складаньня заяў і канчаючы непасрэднай падачай у суд.

Для гэтай-жа мэты ўстаноўлены сыстэматычныя выезды юрысконсультаў у паўныя дні ўвечары ў клюбы імя Ільіча і Леніна, дзе праводзіцца прыём чыгуначнікаў. Праца ў клюбах з кожным месяцам разгортваецца ўсё больш і больш, што даводзіць мэтазгоднасьць гэтага мерапрыёмства.

Устаноўлены таксама сыстэматычныя выезды адзін раз у тыдзень на буйныя прадпрыёмствы г. Менску. Выезды прыстасаваны да часу перапынку на абед і даюць добрыя вынікі.

У галіне папулярызацыі працоўнага права былі праведзены за справаздачны перыяд вечары пытаньняў і адказаў у 9-ці клюбах г. Менску. Вечары гэтыя прайшлі вельмі жвава і прыцягнулі вялікую колькасьць працоўных.

Сыстэма аказаньня юрыдычнай дапамогі прафэсыянальнымі саюзамі зусім сябе апраўдала. Юрыдычная Кансультацыя ЦСПСБ шчыльна зьвязана з шырокімі масамі працоўных. Працоўныя ідуць у Кансультацыю з усімі сваімі спрэчнымі пытаньнямі і атрымліваюць заўсёды дапамогу і падтрыманьне.

З. Рохлін.

Суд.

Зьдзекі, растрата і злоўжываньні Сукеніка.

Сёньня ў Менскім Акруговым Судзе распачнецца слуханьне справы былога начальніка 4 аддаленьня Менскай Гарадзкой Міліцыі Якуба Сукеніка, які ў бытнасьць на пасадах спачатку памоцніка, а потым начальніка міліцыі, ведьмі жорстка абыходзіўся з грамадзянамі, якім прыходзілася сустракацца з Сукенікам, як з начальнікам міліцыі. Калі ў мясцовых газэтах паяўляліся заметкі па адрасу Сукеніка, у якіх адзначалася яго жорсткасьць да насельніцтва, адрыве ад пралетарскіх колаў, скрыўленьнях лініі і нават аб бюракратычных выхадках Сукеніка, якія бязумоўна не падыходзілі Сукеніку, як начальніку міліцыі і члену партыі. Сукенік прачытаўшы тую ці іншую заметку, урачыста заяўляў:

— Пляваць, няхай пішуць,—на тое і паперa, каб на ёй пісаць. Шкода толькі, што ня ведаю прозьвішчы пісак, а то-б адразу расьпісаў морду.

Наогул Сукенік лічыў сабе чуць не гарадзкім прыставам старога часу, як апавяшчае абвінавальнае заключэньня.

Сукенік за час службы шмат каму начасаў твар, сьпіну, пацісаў глодку, выкідаў з канцэляры.

Атрымаўшы ад рэгістратаршы Каструкова 60 руб. прыпіснага збору пад уласную расьпіску—Сукенік растраціў іх, і калі супрацоўніца заявіла, што згубіла расьпіску Сукеніка, ён аддаў яе пад суд за растрату, але нарэшце расьпіска Каструкова знайшла і Сукеніку прышлося заняць самаму месца растратчыка.

Апроч гэтага, Сукенік злоўжываў пасадай начальніка, і маючы як начальнік міліцыі ўплыў на міліцыянэраў, прымушаў іх дзейнічаць незаконна і з карыснай мэтай.

У сьнежні месяцы 1927 г. у дзень 10-цігодзьдзя існаваньня Чырвонай міліцыі прапанаваў міліцыянэрам шляхам падпіскі міліцыянэраў падпесьці яго жонцы Ніне ў час вечару падарунак—гадзіньнік за тое, што яна прыгатавала вячэру к вечару.

Міліцыянэры пусьцілі падпісны ліст, па якому было сабрана 21 р. і на гэтыя грошы куплен і паднесен гадзіньнік жонцы Сукеніка.

Разгляд справы працягнецца некалькі дзён, па справе выклікаецца 42 сьведкі.

Кастроў

Што слухаць па радыё.

ПАНЯДЗЕЛАК, 23 ЛІПЕНЯ.

7—00— 7—25 Інфармацыя СНК БССР.
7—25— 8—05 Беларуская радыёгазэта (з літ. аддз.):
8—05— 8—30 Хуліганства і яго шкодніцтва для вытворчасьці.
8—30—11—00 Канцэрт—тэмавы.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 23-VII 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—60,5, куп. 4—58,5.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—15,5, куп. 5—12,5.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—06, куп. 5—04.

ХРОНІКА.

НА БАРАЦЬБУ З АЛКАГАЛІЗМАМ.

На апошнім пасяджэньні Калегіі Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР быў заслухан даклад д-ра Афонскага аб працы Наркелёгічнага дыспансэру і аб распаўсюджваньні алкагалізму за апошнія гады па БССР.

Калегія пастанавіла арганізаваць пры Лекава-Прафілактычнай часьці Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР сталую нараду з прадстаўнікоў Нар. Кам. Аховы Здароўя, нэрвовай і псыхіятрычнай клінік, Інстытуту сацыяльнай гігіены і іншых лекавых устаноў і інстытутаў.

Камісіяй даручана ў срочным парадку распрацаваць шэраг практычных мерапрыёмстваў па барацьбе з алкагалізмам у БССР.

Ад'езд тав. Чарвякова ў Маскву.

У зьвязку з ад'ездам у Маскву т. Чарвякова А. Г. для выкананьня абавязкаў старшыні ЦВК СССР, часовае выкананьне абавязкаў старшыні ЦВК БССР ускладзена на тав. Хацкевіча А. І.

Прадстаўнік ад БССР на кангрэс пацыфісцкай моладзі.

У Галяндыі ў пачатку жніўня адбудзецца міжнародны кангрэс пацыфісцкай моладзі.

Для ўдзелу ў працах кангресу ад СССР выедзе спэцыяльная дэлегацыя.

Ад БССР на кангрэс паедзе старшыня ЦБ пралетстуду тав. Башмачнікаў.

Падрыхтоўка да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Белсельсаюз даў заяўку „Хлебосоюзу" на завоз у БССР да асеньняй пасеўнай кампаніі 10.000 цэнтнэраў палепшанага жыта.

Гэта жыта будзе завезена з цэнтральных чорназёмных губерняў. Уся партыя гэтага пасеўнага матар'ялу будзе разьмяркоўвацца па сыстэме сельска-гаспадарчай кааперацыі БССР.

Пабудова ізаляцыйна-падсьцілачнага заводу.

З будучага году Белторф пачынае будаваць буйны ізаляцыйна-падсьцілачны завод.

Гэты завод будзе пабудован у працягу 2 гадоў і будзе каштаваць 316.000 руб.

Завод будзе выпрацоўваць у год 5.000 тон ізаляцыйных пліт і 6.000 тон падсьцілкі—матар'ялы, патрэбныя для будаўніцтва.

Гэты завод зьявіцца другім у Савецкім Саюзе.

Мяркуецца загатовіць 530 тон грыбоў.

Наркамгандаль БССР зацьвердзіў плян загатоўкі грыбоў у бягучым сэзоне. Усяго мяркуецца загатовіць па Беларусі 530 тон грыбоў, з іх 400 тон сухіх і 130 тон марынаваных. Вонлуг плану, 180 тон павінен загатовіць Белдзяржгандаль, 200 тон—сельска-гаспадарчая кааперацыя і 150 тон—спажывецкая кааперацыя.

КУЛЬТУРНЫЯ НАВІНЫ.

ВЫДАНЬНІ ГУМАНІТАРНАГА АДДЗЕЛУ ІБК.

У хуткім часе выходзяць з друку «Навуковыя Запіскі» гуманітарнага аддзелу ІБК.

„Запіскі" складаюць навуковую вартасьць ня толькі для Савецкага Саюзу, але і для замежных вучоных.

ВЫВУЧЭНЬНЕ СТАРАЖЫТНАГА ЗАСЛАЎЯ.

Інбелкульт выдаў пасабнай кніжкай адбітак з археолёгічных матар'ялаў ІБК аб археолёгічных досьледах старажытнага Заслаўя пад загалоўкам: „Заслаў на Менчыне". Зроблены нарыс старога Заслаўя на падставе раскопак і інш. матар'ялаў сьведчыць аб тым, што Заслаўе зьяўляецца самым старажытным паселішчам на Беларусі в чыста славянскімі адзнакамі.

Кніжка багата ілюстравана здымкамі знойдзеных пры раскопках рэчаў, Складзена яна т. т. Ляўданскім, Даўгялам і Сьмірновым.

ВЫВУЧЭНЬНЕ АСАБЛІВАСЬЦЯЎ ПОЛЬСКАЙ МОВЫ.

Інбелкульт зараз праводзіць вывучэньне асаблівасьцяй польскай мовы на Беларусі. Праца гэта праводзіцца краязнаўчымі гурткамі на мясцох.

Замежнае ўгнаеньне для БССР.

Нядаўна Белсельсаюзам атрымана з-за мяжы 2100 тон суперфасфату. У бягучым ліпені м-цы чакаецца атрымаць з-за мяжы другую партыю суперфасфату ў 1.300 тон, і з Саюзу 600 тон суперфасфату і 2400 тон фасфарытнай мукі.

Атрыманая партыя суперфасфату разьмяркоўваецца па сыстэме сельска-гаспадарчай кааперацыі БССР.

Трэба адзначыць, што з боку насельніцтва прадпрыймаецца вялікі попыт на мінэральнае ўгнаеньне.

Як праходзіць курортная кампанія па БССР.

Спачатку студзеня м-на да гэтага часу Беларускае Курортнае Бюро прадало курортных месц на суму 204.547 руб. У большасьці курортныя месцы прададзены на Каўкаскія Мінэральныя Воды (у Жалезнаводзк і Кісловодзк), Паўднёвы бераг Крыму (у санаторыі Ялта), а таксама ў Эўпаторыі, Севастопаль і Адэсы.

Адчыненьне выстаўкі паляўнічых сабак.

Учора, 21-га ліпеня ў садзе прапаўнікоў асьветы адчынілася выстаўка паляўнічых сабак. Усяго на выстаўку дастаўлена 177 сабак розных гатункаў: ганчакоў, выжлаў, старажавых, па вышуку і інш. Ганчакі пераважна належаць сялянам, паміж якімі больш усяго пашырана паляваньне. Ёсьць на выстаўцы цікавыя віды выжлаў рудыя, чорныя, сівыя, ангельскія і інш.

У асобным куточку саду зьмясьціліся старажавыя сабакі розных відаў: нямецкія аўчаркі, нюфаундлэнд (мяшанец) і шмат інш.

Выстаўка зачыняецца сёньня ўвечары.

Менскі дзень.

20.000 руб. адпусьціў Белсельбанк доў гатэрміновага крэдыту на ўмацаньне зваротных капіталаў савецкіх гаспадарак Белсельтросту.

У топлівным балянсе прамысловасьці ВСНГ Беларусі роля торфу з 5,1 проц. у бягучым годзе ўзрасьце да 46,5 проц. у 1932-33 г., што значна зьменшыць выдаткі на апал.

Каля 4000 беспрацоўных у сучасны момант занята на грамадзкіх работах па ўсіх округах Беларусі.

10.000 руб. адпушчана дадатнова Мазырскай акрузе на крэдытаваньне жыльлёвага будаўніцтва для рабочых гораду Мазыру.

Устанавіць кантроль за памольным зборам запрапанаваў Белкавсаюз усім акрсаюзам спажывецкай кааперацыі.

Сярод эспэрантыстаў.

4-ты ўсесаюзны зьезд эспэрантыстаў.

Гэтымі днямі ў Маскве адчыняецца 4-ты ўсесаюзны зьезд эспэрантыстаў. Эспэранто зьяўляецца сродкам, які дапамагае міжнароднай культурнай сувязі шырокіх пралетарскіх мас СССР і заграніцы. У Савецкім Саюзе зараз налічваецца 10 тысяч арганізаваных эспэрантыстаў, якія выкарыстоўваюць практычна мову эспэранто.

Сотні-тысячы лістоў атрымоўваюць эспэранто-арганізацыі з-за межаў. Сотні нашых лістоў за межамі выкарыстоўваліся для фабрычных альбо друкаваных газэт.

Беларускія эспэрантысты ў сярэднім у год зьмяшчаюць за межамі 150-175 артыкулаў аб БССР.

Брашура аб Заходняй Беларусі на эспэранто.

Хутка выходзіць з друку ў выданьні SAT брашура аб Заходняй Беларусі і Б. Р.-С. Грамадзе на мове эспэранто. 1000 экз. брашуры будзе разаслана на культурных установах усіх краін сьвету.

Гісторыя эспэранто-руху ў БССР.

Для зьбіраньня матар'ялаў па гісторыі эспэранто-руху на БССР утворана камісія, якая мае намер да 1 сьнежня скласьці кароткі нарыс эспэранто-руху ў БССР.

Падручнік і слоўнік на беларускай мове.

Скончан пераклад падручніка на беларускую мову. Друкавацца падручнік будзе ў Маскве.

Вынікі ўсебеларускай спартакіяды.

Спартакіяда ўпяршыню праводзілася сумесна з войскамі БВА. Спартыўныя дасягненьні, у параўнаньні з леташнімі гадамі, палепшыліся.

Асноўны плюс усебеларускай спартакіяды сёлетняга году ў тым, што яна была праведзена сумесна з войскамі Беларускай Вайсковай Акругі, а адгэтуль сувязь грамадзянскіх фізкультурнікаў з вайсковымі яшчэ больш узмацнілася.

Трэба адзначыць, што спартакіяда праходзіла ў досыць спрыяючых абставінах, чаму значна дапамагла тая ўвага, якую выявілі да яе нашы прафсаюзы і наогул грамадзкасьць.

Напярэдадні ўсебеларускай спартакіяды па ўсіх округах адбыліся акруговыя фізкультурныя сьвяты. Дзякуючы правядзеньню акруговых спаборніцтваў, удзельнікі спартакіяды прыехалі ў Менск досыць добра падрыхтаванымі.

У спартакіядзе, як мы і чакалі, прынялі ўдзел усе округі БССР і склад удзельнікаў, у параўнаньні з мінулымі гадамі, значна палепшыўся. Сярод удзельнікаў спартакіяды вялікі процант займаюць рабочыя, партыйны і камсамольцы. Як вельмі прыемнае зьявішча, можна адзначыць і тое, што сярод удзельнікаў спартакіяды была досыць значная колькасьць сялян-фізкультурнікаў.

Найбольш цікавымі відамі спартакіяды былі гульні і лёгкая атлетыка. Упяршыню на спартакіядзе было праведзена вэлёсыпэднае спаборніцтва па вэлёкросу на 30 кілёмэтраў і вайсковыя палявыя гарадкі. Спаборніцтвы па гэтых відах фізкультуры паказалі, што нашы дасягненьні ў гэтай галіне досыць значныя.

Не зважаючы на тое, што ў гэтым годзе лета на зусім спрыяла для правядзеньня летніх відаў спорту, усё-ж спартыўныя дасягненьні па некаторых відах палепшыліся. К прыкладу маем лепшыя, чым летась, дасягненьні ў скачках у даўжыню для мужчын, у штурханьні ядра, у бегу на 100 мэтр. і інш.

Разам з дасягненьнямі ўсебеларуская спартакіяда дала магчымасьць высьветліць і цэлы шэраг недахопаў, сярод якіх наступныя нездаровыя канкуранцыі двух буйных спартыўных цэнтраў—Менск—Гомель за першыя месцы на спартакіядзе; у спартакіядзе слаба ўдзельнічалі дарослыя рабочыя. Не зважаючы на тое, што гледачоў было шмат, можна было-б чакаць яшчэ большай колькасьці апошніх, але наша спартыўная пляцоўка гэта не дазваляла. Адгэтуль—трэба падумаць аб арганізацыі ў сталіцы БССР больш буйнага спартыўнага стадыёну.

Перад фізкультурным рухам БССР зараз стаяць задачы па яшчэ большаму ўцягненьню дарослых рабочых у гурткі фізкультуры, а таксама па яшчэ большаму прасоўваньню яе ў вёску. Неабходна таксама пад нашу фізкультурную працу надвесьці больш моцную матар'яльную базу, шляхам пабудовы на мясцох спартыўных стадыёнаў, водных станцый, клюбаў для заняткаў і г. д. Трэба таксама завастрыць увагу на разьвіцьцё выхаваўчай працы сярод фізкультурнікаў у сэнсе барацьбы з хворымі зьявішчамі чэмпіянцтва, спартыўнага азарту і нетаварысцкімі адносінамі паміж фізкультурнікамі.

Перад нашымі фізкультурнікамі стаіць задача і па падрыхтоўцы да міжнароднай інтэрнацыянальнай спартакіяды, якая адчыніцца ў Маскве 12 жніўня, а побач з гэтым, трэба разьвіць сярод фізкультурнікаў інтэрнацыянальную працу.

Усебеларуская спартакіяда зьявілася палітычнай дэманстрацыяй баявой падрыхтаванасьці маладой часткі працоўнага насельніцтва Беларусі да абароны краіны, і трэба сказаць, што фізкультурнікі экзамен вытрымалі з гонарам.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**

ЗАКЛЮЧИТЕЛЬНЫЙ БАЛАНС

Белорусского Государственного треста спиртовой промышленности „БЕЛГОСПИРТ"

на 1-е октября 1927 года.

АКТИВ.

	СУММА Частная	СУММА Общая
ИМУЩЕСТВО:		
1) Здания и сооружения	1216923—82	
2) Оборудование, машины и инструменты	858779—76	
3) Инвентарь живой, хозяйств. и тара	189276—02	
4) Транспорт	18600—71	
5) Имущество фонда улучшен. быта рабочих	19791—75	2303372—06
Запасное оборудование		39757—47
Незак. постр. и капитальн. ремонт		60936—72
Расходы по восстановлению винзаводов		38597—15
МАТЕРИАЛЫ:		
1) Основные и сырье	223590—42	
2) Топливо	235198—96	
3) Вспомогательные материалы	177593—68	
4) Рем.-строительные материалы	128901—21	
5) Материалы и топливо в пути и лес на корню	37358—85	
6) Скот	49447—05	852090—17
Неоконченные заготовки и производство		7858—10
		177288—48
Полуфабрикаты		1148—46
Товары и гот. изделия на складах и комис. продукты		32331—33
Касса, тек. счета и переводы в пути		161086—65
Ценные и %% бумаги		12967—24
Паи и акции		11266—32
ВКЛАДЫ:		
1) В Комбанках	4141—33	
2) Ссуда на жилстроительство	906—37	5047—70
ВЕКСЕЛЯ И ДОКУМЕНТЫ К ПОЛУЧ.		
1) В портфеле	90137—63	
2) На инкассо	1600—00	
3) Учтенные и бланкированные	234496—53	
4) Налож. платежи и докум. к получению	1488—08	327722—24
Под'отчетные суммы		55413—00
ДЕБИТОРЫ:		
1) Рабочие и служащие	5856—01	
2) Поставщики и подрядчики	108141—37	
3) Покупатели и заказчики	48689—81	
4) Прочие дебиторы	62564—63	
5) Сомнительные должники	67243—15	292494—97
РАСХОДЫ БУДУЩИХ ЛЕТ:		
1) Разные расходы	29105—83	
2) Капитальн. затраты по арендов. имуществу	8305—07	37410—90
БАЛАНС		4416788—96

ПАССИВ.

	СУММА Частная	СУММА Общая
КАПИТАЛЫ:		
1) Уставный капитал		2256496—94
2) Резервный		12192—00
3) Амортизационный		108494—73
ФОНДЫ И РЕЗЕРВЫ:		
1) Фонд по улучшению быта рабочих;		
а) в закончен. имущ. 19791—75		
б) в незаконч. „ 4644—14	24435—89	
в) в ссудах на жилстроит.	5047—70	
г) свободный остаток	15500—74	44984—33
2) Резерв по сомнительным долгам		67243—15
3) „ на снижение цен		239—04
ЗАЙМЫ, ССУДЫ И КРЕДИТЫ:		
1) НКФин. по ссудам из чрезвычайного бюджета	169750—00	
2) По Центроспирту	184081—36	353831—36
Векселя выданные		30013—07
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА ПО БЛАНКОНАДПИСАТЕЛЬСТВУ		
1) Банки по учету векселей	208618—23	
2) Разные лица по бланк. векселям	25878—30	234496—53
КРЕДИТОРЫ:		
1) Рабочие и служащие	10152—41	
2) Поставщики и подрядчики	29334—79	
3) Покупатели и заказчики	638—61	
4) Центроспирт	729335—10	
5) Неоплач. налоги, сборы и абяз. взносы	46—50	
6) Разные кредиторы	38604—00	808111—41
Доходы будущего года		41531—10
ПРИБЫЛЬ:		
Прибыль за отчетный год	459155—30	459155—30
БАЛАНС		4416788—96

ЗАБАЛАНСОВЫЕ СТАТЬИ.

1) Арендованное имущество	92917—45	1) Арендодатели	92917—45
2) Векселедержатели в обеспечен.	218324—23	2) Гарантийные векселя выданные	218324—23
3) Гарантийные векселя	3750—00	3) Залогодатели	3750—00
	314991—68		314991—68

ВНЕБАЛАНСОВЫЕ СТАТЬИ.

Земля 2778,57 гектар. . . . . 228582—78

СЧЕТ ПРИБЫЛЕЙ и УБЫТКОВ.

ДЕБЕТ

1) Обще-административные расходы	123847—91
2) Торговые расходы	78936—21
3) Проценты уплаченные	52393—40
4) Отчисл. в резерв по сомнительн. долгам	23220—78
5) Убытки от списан. нереальн. долг.	338—85
6) Обще-заводские расходы по 5 заводам бывш. Гомспирта и Яновского заводу	41794—62
7) Разные убытки и расходы	45160—30
	365692—07
8) Чистая прибыль	459155—30
	824847—37

КРЕДИТ

1) Прибыль от реализации товаров и полуфабрикатов	669331—43
2) Проценты полученные	21237—14
3) Разные доходы	134278—75
	824847—37

РАСПРЕДЕЛЕНИЕ ПРИБЫЛЕЙ.

Из выявленной за отчетный год прибыли в сумме . . . . Руб. 459155—30
Исключается в оплату подоходного налога (10 проц.) . . . . „ 45915—53
Оставшаяся сумма . Руб. 413239—77

РАСПРЕДЕЛЯЕТСЯ:

10 проц. в резервный капитал	Р. 41323—98	
10 проц. в фонд по улучш. быта рабочих	41323—98	
0,25 проц. в фонд премирования	1033—06	
35 проц. в доход казны	144633—93	
10 проц. в фонд ОДК	41323—98	
10 проц. в фонд спец. средств	41323—98	
24,75 проц. в фонд расширения	102276—86	Р. 413239—77

Зам. Управляющего трестом С. Т. ШЕМПЕЛЬ. **Главбух Л. С. БЕРКОВІЧ.**

Гэты балянс, рахунак прыбыткаў і страт і разьмеркаваньне прыбыткаў зацьверджаны Прэзыдыумам ВСНГ БССР у пасяджэньні ад 13 IV—28 г. (прат. № 30, арт. 301) і Кантрольна-Фінансавым Кіраўніцтвам ВСНГБ да абвяшчэньня дазваляецца.

Начальнік Кантрольна-Фінансавага Кіраўніцтва ВСНГ БССР **ПАГОСЦКІ.**

ТЭАТР—КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71.	Апошняя навінка дзяржкіно Грузіі „ПЕРШАЯ І АПОШНЯЯ". Драма ў 8 частках. Звыш праграмы—гастролі Л. З. Леанідава і Я. Арэат.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	Амэрыканскі фільм „ТРЫ ІСПЫТЫ". Звыш праграмы—канцэртнае аддзяленьне.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	Сёньня новая праграма. „ЦЫРК ПОМЭРА". Пачатак а 7 з пал. гадз.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Толькі 3 дні—20, 21 і 22 ліпеня КАНДРАД ВЭЙТ у фільме „ЦІ СЬМЕЕМ МЫ МАЎЧАЦЬ" Драма ў 7 частк.

Беларуская Райённая Кантора УКРАІНЛЕСА абвяшчае на 1-га жніўня а 10 гадзіне раніцы на ст. КРУПКІ

ЗЬМЕШАНЫЯ ТАРГІ

на продаж цэмантнай клёпкі ў колькасьці 462 к-м., якая знаходзіцца на ст. КРУПКІ МБЖ чыгункі балянсавым коштам 4902 р. 50 к.

Да таргоў дапушчаюцца дзяржаўныя ўстановы, грамадзкія і кааперацыйныя арганізацыі, а таксама прыватныя асобы.

Ня вызваленыя ад закладу павінны ўнесьці перад таргамі заклад у разьмеры 10 проц. кошту тавару.

Усе спраўкі і аглядаць клёпку можна штодня на ст. КРУПКІ МБЖ чыгункі ў супрацоўніка Украінлеса тав. ЗРУБОВІЧА.

ЭЛЬВОД

купляе ў неабмежаванай колькасьці **ТОРФ** машыновай і ручной выпрацоўкі.

З прапановамі зьвярнуцца ў Менск, Савецкая № 110, дзе можна азнаёміцца і з тэхнічнымі ўмовамі.

ШУКАЮ свайго сына ВАСІЯ САМУЙЛАВІЧА ДЗЯМЬЯНКАВА, 13 гадоў ад роду, які знаходзіўся ў Чарыкаўскай больніцы і адтуль зьбег 22-га лістапада 1927 году невядома куды.

Асоб, якія ведаюць яго месца пражываньня, прашу паведаміць на адрасу: г. Клімавічы, дом інвалідаў ДЗЯМЬЯНКАВАЙ АРЫНЕ.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Мэтрычн. выпіс Каман Н. А.
— Асабовае пасьведчаньне, адрэзак В, сяброўская кніжка, выд. саюзам чыгуначнікаў, сяброўская кніжка Мопра, білет вобч. „Динамо" на імя Дубоўскага І. А.
— Мэтрычная выпіс Нісенбаўма Я. І.
— Кааперац. кніжка „Смычка" Ламаповіча Ю.
— Конская кніжка Бобрыка А. П.
— Сяброўская кніжка № 184 ЦРК Малкіна Л. З.
— Лекавая кніжка № 13166 Шкляр С.
— Атэстат аб скончэньні школы Дзямінхоўскага Л. А., выд. 2 вячэрн. школай павышанага тыпу, кв. 898.
— Паявая кніжка № 3274 Брыгіна П., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 899.
— 3 паявыя кніжкі за №№ 1561, 95, 315 Дарафэйвай А., выд. Прыгародным снаж. т-вам, кв. 90.
— Паявая кніжка № 15504 Кульгавага выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 901.
— Дапрызыўная кніжка Сахончыка П. Ц., выд. Зембінскім РВК, кв. 902.
— Студэнцкае пасьведчаньне за № 3-527 Сарока Н. В., выд. БДУ, кв. 903.
— Вучотна-вайсковы білет Ржэўскага А., выд. Барысаўскім ваенкаматам, кв. 904.
— Конская карт. Пахамава І., выд. Жлобінскім РВК, кв. 905.
— Мэтрычн. выпіс аб нарадж. Бобра А. А.
— Мэтрычн. выпіс аб нарад. Карэктара Х. М.
— Мэтрычн. выпіс Гарбер Л. М.
— Лекавая кніжка Цэлеш Е. Д.
— Конская карт. Савенка Я.
— Конская карт. Міцкевіча Т.
— Мэтрычн. выпіс № 108 Цьверскай Х.
— Конская карт. Багданіка А.
— Кааперац. кніжка № 263 Гальперына С. М.
— Пасьведчаньне, выд. Калінкавіцкім РВК і расіска судзьдзі выканаўца на імя Фінбэрга Ш. Х.
— Конская карт. Цэляпуна С.
— Конская карт. Бобра Ц.
— Запісь а нарвідзе № 64 Рабіновіча Ф.
— Мэтрычн. выпіс Гарэліка М.
— Мэтрычн. выпіс № 387 Альтшуля Р.
— Камсамольскі білет № 10115 ЛКСМ Ліўшыца Х.
— Лекавая кніжка № 6006 Казьміраўскай П. Г.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА